Літаратурная Беларусь

Выпуск №2 (174)
(люты)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by



Змест

«Чакае перамога нас»



Гэта крык, што жыве Беларусь

Янка КУПАЛА,
Народны паэт Беларусі

Ці завылі ваўкі, ці заенчыў віхор,
Ці запеў салавей, ці загагала гусь, —
Я тут бачу свой край, поле, рэчку і бор,
Сваю матку-зямлю — Беларусь.
<…>

Тут усякая рэч як гавора з табой:
І крывая бярозка, і столетні дуб,
Снег халоднай зімой,
траўка летняй парой,
І асвер, і абцінены зруб...

А бурлівы ручай і зялёненькі сад! —
Хоць, брат, сэрца аддай
і душу хоць аддай!..
Сам садочак садзіў гадкоў
дваццаць назад,
А цяпер жа вялікі, як гай!
<…>

Ды і што гаварыць! —
дзе я толькі гляджу,
Бачу родненькі край,
сваю матку-зямлю;
Тут і людзі... ат... што!..
аб іх потым скажу...
Долі іх надта ж я не люблю!..

А вот як не любіць гэта поле, і бор,
І зялёны садок, і крыклівую гусь!..
А што часам тут страшна
заенча віхор, —
Гэта енк, гэта крык, што
жыве Беларусь!

[1905–1907 гг.]

Пагоня

Максім БАГДАНОВІЧ

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, —
Ўспомню Вострую Браму святую
І ваякаў на грозных канях.

Ў белай пене праносяцца коні, —
Рвуцца, мкнуцца і цяжка храпяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

У бязмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі — гады.
Вы за кім у пагоню спяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

Мо яны, Беларусь, панясліся
За тваімі дзяцьмі наўздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?

Біце ў сэрцы іх — біце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць...

Маці родная, Маці-Краіна!
Не усцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..

Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

1916 г.

Покліч

Уладзімір ЖЫЛКА

Пад штандар бел-чырвона-белы
Гартуйся, раць, адважна, смела
Адважных, храбрых ваякоў!
І ўспомняцца старых вякоў
Паходы мужныя у славе,
Часы Альгерда, Ізяслава,
Грунвальдскі з немцам бой!
І боек даўні цяг з Масквой!

Пад знак Літоўскае Пагоні –
Абараняць краіны гоні,
Народ забраны вызваляць,
Ісці к святлу, святлом палаць –
Спяшайся той, хто к волі рвецца,
Ў кім беларуса сэрца б'ецца!
Збірайся – ўсе, як бы адзін, –
Арлы радзімых пушч, нізін!

Не плач, не плач па сыну, маці, –
Сягоння сорам быць у хаце,
Бо ўзнят за волю грозны меч,
Бо хутка будзе злая сеч,
Няхай і ён, юнак адважны,
Ідзе туды, дзе б'ецца кажны
За волю новую без слёз,
За лепшы Бацькаўшчыны лёс.

Пад штандар кожны здатны, гожы,
Досць нас наезнікам варожым
Трымаць ў прыгоне, беднаце,
Смяяцца нашай цемнаце,
Багацце краю нішчыць, пляжыць –
Чужынцу годзе намі княжыць
І карыстацца з нашых плеч!..
Мы к волі йдзем – з дарогі прэч!..

1920 г.

Ты чуеш, брат?

Максім ТАНК,
Народны паэт Беларусі

Ты чуеш, брат, як на прадвесні
Вятры, лёд крышучы, гудуць,
Як на сваю радзіму з песняй
Зноў птушкі з выраю лятуць?

Пагоні сілы баявыя,
І вы рыхтуйцеся ў паход,
Каб знішчыў путы вякавыя
Наш заняволены народ.

Глядзіце ў будучыню смела!
Настаў доўгачаканы час,
Пад сцягам бел-чырвона-белым
Чакае перамога нас.

Няхай жа меч Пагоні ззяе!
Гартуйма нашу еднасць, моц!
Вядзі нас, Воля прасвятая,
Да новай славы, новых сонц!

1930 г.

Васіль БЫКАЎ,
Народны пісьменнік Беларусі, ветэран Вялікай Айчыннай вайны

Бела-чырвона-белы сцяг ім, бачыце, ненавісны за тое, што яго насілі паліцаі. Дык паліцаі насілі ж і штаны, што ж тады вынікае з вашых... высноў, шаноўныя панове? Няма сумнення, усё гэта будзе смешна і недарэчна нават праз вельмі кароткі час. Але цяпер не смешна. Цяпер балюча і крыўдна, бо тупы жандарскі бот па-ранейшаму папірае і фізічнае існаванне нацыі, і яе стогадовыя духоўныя набыткі. Якія яна па крошцы выпрацоўвала ўласнымі высілкамі, высілкамі сваіх найлепшых людзей, збірала і зберагала — праз войны, голад, галечу, іншаземнае панаванне.

Ніл ГІЛЕВІЧ,
Народны паэт Беларусі

— Як вы, Уладыка, ставіцеся да бел-чырвона-белага сімвала як сімвала нашага дзяржаўнага сцяга?

Мітрапаліт Філарэт:
— Як жа я магу ставіцца да сімвала крыві Хрыста, пралітай на белую плашчаніцу?! Толькі станоўча!
(1995 год, пасяджанне камісіі Вярхоўнага Савета Беларусі пры вырашэнні пытання пра дзяржаўную сімволіку)

Рыгор БАРАДУЛІН,
Народны паэт Беларусі

***

На белай кашулі чырвоны пісяг
Ад злосці падступнага меча.
Бел-чырвона-белы балючы сцяг
Склікае на сумнае веча.
<…>
Узвіўся, як крык, на крыжацкіх касцях —
І поганьне кіруе ў прадонне —
Бел-чырвона-белы крывіцкі сцяг
У вечным памкненні Пагоні!

<…>
Мы — ратáі святла,
Крывічы,
Верхачы неўміручай Пагоні.
Маладзік сакалом на плячы,
Гартны меч у цвярдое далоні.

Лучыць нашыя мары рака
Бел-чырвона-белага сцяга.
Дваццаць пятага сакавіка —
Наша свята,
Пароль
І прысяга!

Вольга Бабкова: «Жывём, хоць і дыхаць цяжка»

Вікторыя ЧАПЛЕВА

Хто такая Вольга Бабкова? Пісьменніца, якая ажывіла стары Менск. Адна з купалаўцаў, якая пасля сямі гадоў працы ў тэатры ў знак пратэсту сышла разам з усімі. Архівістка, якая з асалодай чытае акты на старабеларускай мове. І яшчэ вельмі шчыры і таленавіты чалавек.

Спадарыня Вольга 27 лютага адзначае сваю «круглую» дату.



Вольга Бабкова. Фота www.kupalauski.by

— Спадарыня Вольга, чаму вы вырашылі звязаць жыццё з даследаваннем гісторыі?

— І гісторыя, і тэатр вывучаюць чалавека. Я не пайшла ў навуку, бо мяне цікавіць менавіта адчуванне чалавека ў свеце: ён нараджаецца, праходзіць пэўныя этапы, але напрыканцы ўсіх чакае адно і тое ж. І гэтае адно і тое ж — самая вялікая таямніца.

— Чым найбольш запомніўся тагачасны гістфак БДУ?

— Я вучылася на вечаровым факультэце, таму са мной побач былі людзі самых розных узростаў. Там я пазнаёмілася са сваім сябрам Фёдарам Крываносам, які цяпер — праваслаўны святар. Ён адкрыў для мяне дысідэнцкую літаратуру, якая на той час была забаронена. Аднойчы ён запрасіў мяне паехаць на Вялікдзень у Загорск (Сергіеў Пасад, — В.Ч.). Для мяне тады Вялікдзень — гэта было нешта прыгодніцкае і магічнае... Памятаю, што пад час вучобы над нашым менскім Аляксандраўскім скверам навісла страшэнная пагроза: там хацелі высекчы ўсе стогадовыя дрэвы. Калі я пачула пра гэта, то вырашыла, што калі прыедуць бульдозеры, я прыйду і лягу пад колы. Але, дзякуй Богу, гэтая ідэя пажыла ў шалёных галовах і знікла.

— Ці думалі, чым будзеце займацца пасля таго, як скончыце вучобу?

— Асабліва не думала. Спачатку я хацела быць мультыплікатарам, пасля — археолагам. Але выпадкова апынулася ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, там і засталася працаваць. Цікава, што самыя важныя і значныя для мяне людзі знайшліся менавіта ў архіве. У дыпломнай працы я параўноўвала выгляд рэканструяваных помнікаў сталіцы: як яны выглядалі раней і іх актуальны стан.

— Ваша знітаванасць з Менскам — гэта вынік дыпломнай працы ці яна існавала яшчэ раней?

— Калі б яе не было, я б не абрала такую тэму дыпломнай працы. Я любіла горад на падсвядомым узроўні. Гэтаму спрыялі мае бацькі. Хоць яны нарадзіліся не ў Мінску, але яны вельмі любілі яго фатаграфаваць. Калі пазней я прасіла бацькоў згадаць нешта пра Мінск, яны ўзгадвалі проста неверагодныя дэталі! Напрыклад, у якой краме чым пахла, якія гукі даносіліся з лабараторыі Медыцынскага ўніверсітэта... Памятаю, як я, зусім маленькая, ішла з татам па старой, яшчэ не перабудаванай Нямізе...

Мінск для многіх пусты і халодны савецкі горад, але я хаджу па ценях старых забудоў. Проста нехта бачыць гэта, а нехта — не.

— Якім чынам з'явілася кніга, складзеная з вашых эсэ «...І цуды, і страхі»?

— Я расчытвала ў архіве судовыя справы: маёмасныя спрэчкі, забойствы, абра́зы... Там знаходзіла дэталі, якія былі мне неверагодна цікавыя. Толькі ўявіце сабе, якія імёны былі ў людзей: Ян Зімапад, Васіль Клюйвада... Гэта ж цэлы свет! Я ішла на працу, дзе мяне чакалі неверагодныя адкрыцці і скарбы. Пасля зразумела, што нешта можна распавесці пра вяселле, дарогу, імёны... Эсэ я друкавала ў газеце «Наша Ніва». Аднойчы муж падаў некуды рукапісы, і яны перамаглі... У той час я ляжала ў шпіталі, таму ў мяне не было часу давесці іх да ладу. У выніку зусім хутка выйшла кніга «...І цуды, і страхі»...

У мяне мэта была зацікавіць простых людзей неверагоднай палітрай Сярэднявечча. Навуковыя кнігі не ўсе чытаюць... Аднак я не падавала гэтыя эсэ як літаратуру. У мяне не было адмысловага стылю, пісала так, як уяўляла. Самае вялікае нараканне было з боку гісторыкаў: я не пакінула спасылкі на вопісы, з якіх брала матэрыял.

— Калі вы наогул пачалі пісаць?

— Мая творчасць пачалася тады, калі мы ў сям'і вырашылі размаўляць па-беларуску. Гэта быў крок штучны, безумоўна, бо ў мяне не было нікога ў вёсках. Але гэта быў наш пратэст супраць савецкасці і бальшавізму, які сядзеў у галовах людзей. Сваё першае апавяданне «Крумкач і Франка» я напісала, калі зламала нагу і месяц нікуды не выходзіла. Але як доўга я гэтае апавяданне насіла ў галаве! Асабліва атрымліваецца запісваць назіранні пад раніцу, калі раскладваеш сябе, як слаісты пірог. Я пішу рэдка, але штодня занатоўваю свае думкі. Шмат ужо набралася такіх назіранняў... Аднак, мушу прызнацца, што я занадта шчодра раскідваюся часам. Мне падаецца, мы самі ўзялі і падзялілі час на рысачкі. Лічбы — гэта не маё, я заўсёды ў іх блытаюся.

— Чаму пасля столькіх гадоў працы вы раптоўна ў 2013 годзе сышлі з Нацыянальнага беларускага архіва працаваць у Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы? Надакучыла?

— Не, не надакучыла. З канца 90-ых па 2013 год я працавала з дакументамі XVI–XVIII стагоддзяў. Навучылася чытаць старабеларускія і старапольскія тэксты... Мне захацелася нешта моцна змяніць. Калі доўга сядзіш на адным месцы, хочацца пабачыць іншыя далягляды. Я разумела, што ў мяне не такі ўзрост, калі можна ісці ў нейкія праекты. Але раптам патэлефанаваў Мікалай Пінігін і прапанаваў пасаду кіраўніка літаратурна-драматургічнай часткі. Гэтая прапанова дзіўным чынам адпавядала маёй празе да зменаў. З Мікалаем Мікалаевічам мы сустрэліся, паразмаўлялі, я сказала, што па жыцці я сацыяфоб. Я разумела, што я не ведаю спецыфікі працы, але мне хацелася паспрабаваць. Я зрабіла крок абсалютна для сябе нечаканы. Нехта мяне наогул не зразумеў. Але я не шкадавала аб такім рашэнні. Тэатр — гэта такая ж таямніца і гісторыя пра людзей.

— Адразу ўцягнуліся ў працу?

— Досыць павольна. Але для мяне там кожны дзень быў выклік. Мне часам званок складана зрабіць... А тут нам тэлефанавалі розныя драматургі, жанчынкі, якія былі перакананы, што іх тэма ў п'есе — самая важная. Адразу ж на мяне прыйшла скарга ў Міністэрства культуры, маўляў, я няветліва размаўляла з чалавекам...

— Ці балюча было сыходзіць з тэатра разам з іншымі «купалаўцамі» ў знак пратэсту супраць звальнення Паўла Латушкі?

— Мы зрабілі зварот супраць гвалту са сцэны Купалаўскага тэатра, калі яшчэ былі «купалаўцамі». Літаральна адразу ўсіх, хто стаяў на сцэне, загадалі звольніць. Але дырэктар сказаў, што звальняць нікога не будзе. Пасля прыехаў міністр культуры і са сцэны паведаміў, што дырэктара звальняюць, бо ў яго скончыўся кантракт... Я не разумею, навошта дарослым людзям хлусіць са сцэны? Тады мы падалі заявы на звальненне. Самае сумнае, што я не бачу канца ўсяму гэтаму. Ідзе татальная зачыстка беларускага свету. Зачышчаюць па д'яблавым плане...

— Ёсць жыццё пасля звальнення з Купалаўскага тэатра?

— Я вярнулася працаваць у архіў на палову стаўкі. Але мае ўсе думкі толькі аб тым, што цяпер адбываецца ў краіне. Цяжка дыхаць, прытым не толькі ад каронавіруса, але і ад таго, напрыклад, што мая лепшая сяброўка, з якой я пазнаёмілася ў архіве (Юлія Слуцкая, — В. Ч.), цяпер на Валадарцы. А колькі яшчэ маіх прыяцеляў — недзе? Я заўсёды думала: як у 1942–1943 гадах, калі пачалося знішчэнне мінскага гета на Нямізе, увесь горад працягваў жыць сваім жыццём? Людзі хадзілі ў філармонію, якая адчынялася, у кіно... А побач цяклі рэкі крыві. Людзі не маглі не ведаць, што там адбывалася. Горад увесь прапітаны крывёю. Цяпер я іду міма Валадаркі, ведаючы, што там сядзіць мая сяброўка, але я прыходжу дадому, гатую вячэру, п'ю каву і нават магу ўсміхнуцца... Столькі пакутаў вакол, але мы прыцягваем жыць. Зразумела, жыць не гарманічным жыццём, не шчаслівым жыццём... Але жывём, хоць і дыхаць цяжка.

Я вельмі сумую, што не магу прыйсці ў Купалаўскі тэатр, не магу сесці на адкіднoе крэсла... Але цяпер Купалаўская трупа рыхтуе вельмі цікавы спектакль. Я не буду раскрываць падрабязнасці, скажу толькі, што я спрычынілася да яго не толькі вычытваннем тэкстаў, але і тым, што перадала пару рэчаў для рэквізіту.

— У адным з нумароў газеты «Новы Час» быў апублікаваны ваш ліст да Юліі Слуцкай. Магчыма, цяпер у Беларусі паўстае новы кірунак літаратуры — лісты за краты?

— Калі мы перакрочым гэты страшны час, я думаю, што сапраўды гэта стане асобным кірункам у літаратуры. Толькі б нам застацца чыстымі, каб выйсці ні душой не пашкоджанымі, ні целам. Я напісала Юлі 10 лістоў — яна не атрымала ніводнага. Пра гэта сказала яе дачушка, якая атрымлівае ад яе лісты. А мае 10 лістоў Юля не атрымала. Я пісала ёй па адным вершу... Можа, іх спалохалі вершы?

— Думаю, што вы ведаеце месцы ў Мінску, якія могуць надаць сілы?

— Я вельмі люблю могілкі, асабліва чынам люблю Кальварыю. Паказальна, што ў касцёле на Кальварыйскіх могілках я хавалася ад тых чорных людзей, якія разганялі беларусаў. Люблю і Вайсковыя могілкі, і Чыжоўскія. Люблю касцёл святога Язэпа, які знаходзіцца каля Ратушы. Некалі гэта было месца, дзе трымалі ў зняволенні паўстанцаў Каліноўскага. Я жыву каля стаўка Мухля, якому больш за сто гадоў. У нас расце шмат груш, таму наш раён я ўмоўна называю «Падгрушшам» — ён знаходзіцца недалёка ад «Грушаўкі». Наш раён вельмі зялёны, таму калі я хаджу па ім, мне добра. Але ўмоўна добра. Сёння нідзе не бывае добра. Мы знаходзімся ў нейкім коміксе, толькі трагічным і крывавым. Памятаю момант, калі мы з сям'ёй сталі на рагу Гарадскога вала і бачылі, як у бок Мельнікайтэ ехалі крытыя брызентам грузавікі з салдатамі... І тады я ўсвядоміла, што яны едуць па тэрыторыі былога гета. У мяне адбылося абсалютнае накладанне гістарычных часоў, бо была жахлівая акцыя, калі грузавікі з нямецкімі салдатамі заязджалі ў гета дзеля расстрэлу людзей. І зноўку адбывалася тое ж самае. Яны ехалі, каб чыніць гвалт супраць свайго ж народу!..

— І — на завяршэнне: ці чакаць нам цыкл эсэ пра тэатр?

— Магчыма, бо мне ёсць што згадаць. Напрыклад, як сябе паводзяць людзі, чым тэатр адрозніваецца ад архіва, якія эмоцыі вірую́ць... Паўсюль жа людзі! Мне падабаецца пісаць пра людзей, якіх я люблю. Калі ты пішаш, укладаючы эмоцыі, атрымліваецца жывы і цёплы тэкст.

Я знайшла цікавы дакумент 1778 года, буду яго апісваць. Наш намеснік дырэктара па навуцы прапанаваў увесну правесці цікавы круглы стол па тэме ўспрымання смерці ў грамадстве. Што такое тэстамент, апошняя воля чалавека? Як мы цяпер да гэтага ставімся? Як такое стаўленне змянілася са стагоддзямі? Людзі адны і тыя ж, а стаўленне да смерці змяняецца. Тое, што «за мяжой» — абсалютна нам невядома. Аднак усё самае важнае мы носім у саміх сабе. Кожны чалавек — гэта сусвет. Чалавек жыве вельмі мала. І калі я думаю пра тое, колькі часу ён марнуе на спрэчкі і сваркі, то ў мяне ўсё перакручваецца... Як можна марнаваць такое кароткае і прыгожае жыццё на стварэнне ідэалогіі, якая забівае? Мы так мала жывём, каб траціць бяздарна свой час.

Ноч Айчыны



Марыя БАРАВІК

22 лютага Марыя Баравік адзначыла сваё 75-годдзе. Яна нарадзілася ў вёсцы Прэабражэнка Глыбоцкага раёна. Скончыла Перадольскую сямігодку, Падсвільскую сярэднюю школу і БДУ (аддзяленне журналістыкі). Аўтарка ўзнёсла-лірычных зборнікаў паэзіі і прачулых эсэ. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў. Жыве ў г. п. Падсвілле Глыбоцкага раёна.

Два сэрцы на вадзе

На шэрай плыні адзінокі птах —
Не мае шчасця ўзняцца на крыло,
Бо два патрэбны на нябесных ўзмах.
І маё сэрца разам паплыло.
Цяпер на возеры два сэрцы,
два трывожных —
На цёмнай плыні два бездапаможных.

На возеры крыло...

Снег яшчэ нібы цёплы лепіць...
Душой гляджу, і ў гэткім стане
Яна ніяк не перастане
Сніць сон, як любіць неба лебедзь:
Крылом адзіным узмахне
І на вадзе ляціць у сне...
Прастору веяй заняло.
На возеры ляжыць крыло.
І пух на ім не лебядзіны.
На сціхлай плыні ткуцца льдзіны.
Між імі дыхае рукаў;
Ён у вачах маіх — рака,
Што сіліцца стварыць цячэнне
Ў такім засіллі атачэння...
Дык у нявολі і вада?
Радзіма? Лебедзь? Во — бяда!
І ў думкі шлях балюча-кружны.
Адно нам застаецца — мужнасць.
Туды-сюды, як гэты лебедзь,
Зірну, дык толькі мара ў небе.
І во з яе была праліта
Мая асенняя малітва...

Ноч Айчыны ўскіне лічбу зорак

Быў агонь на захадзе паўднёвым —
Калыхнуўся вірам у вачах.
Недзе за зубчастасцю хваёвай,
Мне здалося, жар яго ачах.
Ці паэт, ці казачнік паўторыць:
«Зоркі ў небе цяжка палічыць».
І зусім не ўбачыць іх падворак,
Дык я — во падумала аб чым:
«Аўтазакі ў тым баку — у зморы.
Працавалі — могуць паўтарыць...»
Сёння ноч ускіне лічбу зорак:
Тысячы, прыблізна, паўтары.

8 лістапада 2020 г.

***

Мой чытач, метафарай не грэбуй.
Зорка-вобраз мае прататып...
Шмат аб чым паэту кажа неба,
І святло падказвае матыў.

Як знутры напружылася вока,
З таямніцы веры і надзей,
Размаўляць мне з зоркаю высокай
Паэтычнай моваю прасцей.

Зоркі руху, вы не ў галаслове,
Неба дасць — надзеяю завяршыць.
Вы не ў затуманенай выснове —
Вы ў маёй галактыцы душы.

***

Збягае год імклівa, незваротна.
Ён ярка падвыразніў зрок народны.
Паставіў веру ў даляглядны круг,
Бо нарадзіўся беларускі дух.
Народзе дарагі мой, не сумуй!
І той, хто за руку бярэ зіму,
І той, хто духам адштурхнуў турму.
Дык будзьма разам — не па-аднаму
Сярод зямной і зацяжной нявολі!
І з'явіцца зара на белым полі!

26 снежня 2020 г.

Чорным фронтам — на жыццёвы колер

Так дзіўна звыш нам дадзена святло —
Наш белы свет — агульнае жытло.
Ад гарызонта кажа нам чырвоным,
Што ноч для нас не зробіцца палонам.
Пакуль яно жыве, стаіць, гарыць,
Яго чакаем — працу паўтарыць,
Яго чакаем — радасць паўтарыць



Фота www.photosight.ru

І — да свабоды ўстойлівы парыў,
Бо зорка-сонца — свеціць нам з гары,
І на зары, у чырвані-віры,
Каб мы ў святле маглі, як дзень, расці
У бел-чырвона-белым пачуцці,
У гарце духу, думкі, без ныцця...
Дык паляванне ўбачылі на сцяг...
Такога не было яшчэ ніколі,
Каб чорным фронтам —
на жыццёвы колер.
«Без злосці, без замаху, без ironій
Мы ўсё ж жыццёвы колер абаронім!
Я патлумачу», — думаў Бандарэнка, —
Як разбурэнне трапіла у зрэнка...

Хачу гілёў!

Якімі час навінамі расце?
Чакаць якога колеру падзей?
Сасновы бераг вунь — блакітны цень
Паклаў на грудзі белыя вадзе.
А што яшчэ ў нас блізка ад людзей?
Рабіны гронкі побач — анідзе.
Каліны гронкі побач — анідзе.
І птушачкі чырвонай на кусце...
Дык у вачах тут і кустоў няма.
Куды прыйшла ты, белая зіма?
Мяне прыпёк самоты вугалёк.
Не ведаю, ці ёсць у мары клёк —
Ёй для натхнення хочацца гілёў,
У куст, каб не маркоціўся галлём.
Чырвонагрудкі лёгкай, і на белым.
Мая душа тады спяваць хацела б.

11 студзеня 2021 г.

Бацькоў асветніцкія словы

Сню: заблудзілася між кніжак, між тамоў;
Сню, што над імі схілены галовы...
А я нібы шукаю шлях дамоў —
Прарочыя пачуць ад бацькі словы.
Во той праўдзівы, просты татаў сказ,
Канкрэтны змест якога спраўдзіў час.
Якая далячынь ад той пары!
Як хочацца з бацькамі гаварыць!

Татава бярозка

Ёсць меса за полем і вёскай...
І тое, дзе пуста, і тое,
Дзе дол засцілала бярозка
Увосень самотнай слатою.

Яна — самасейка над татам,
Насупраць вачэй яго прама.
Прайшла каранямі праз маму.
Паспелі — пагладзілі з братам...

Бывала, памацаю зрокам
З гары Гарадзішча здалёку —
Знаходзіла месца здалёку —
І поле прамервала крокам.

Дык зрэзана тая бярозка —
Не гладзіць мне сумныя плечы.
Цяпер яна — свечачка з воску;
Нібыта й суцешыцца нечым...

Ані хвілінкі

Ніякай іншай мэты — духапраца,
Калі душа асветлена знутры.
Параіў Бог мне цудам захапляцца
І болем ззяць, як дзьмуць вар'ят-вятры.

На іншае няма ані хвілінкі
На рух да хлеба, слыннасці якой...
Ад болю загараюцца іскрынкі —
Ад Бога пасылаецца спакой.

20 лістапада 2020 г.

Прыход дня



Таццяна ЯЦУК

На перавалах

Том жыцця не першы прачытала,
Ды ўсё невукам лічу сябе.
Шчасце зведала і бед нямала,
Там, на тых няпростых перавалах,
Прызначала ростані журбе.

А жыццё свае іспыты ткала,
Рубцавала раны на шляху.
Доля закружылася навалай,
А цяпло па кроплі частавала
Сілай у пякельным бальнягу.

І святло далёкае вакзалаў
(Ростань і сустрэча — спарышы)
Адляцела, адплыло, растала.
І здалося неймаверна мала
Светлых дзён у шчасця на мяжы.

Ну, а я па лёсе веславала:
Кветкі на вясле і ледзяшы.
У маўклівых зараслях крушын
Так рашуча праўду ўваскрашала,
Адраджала вераю душы.

Адраджала, а ці адрадзіла?
Цяжка нам паверыць у цяпло,
Дзе сумёты снегу намяло.
Вечар лечаць кроплі дзівасілу,
І памалу ўваскрасае сіла
На шляху, дзе паміраe зло.

Снягі

Я так люблю, калі ідуць снягі,
Няхай прабачаць за любоў шафёры:
Нялёгка ім зімы выносіць нораў,
Калі дарога — белыя кругі.

А я люблю ціхмяныя снягі,
Без мітусні, без беганіны і спешкі,
Калі на вуснах шчырая ўсмешка,
А на душы крышталікі тугі.

Бялюткі снег з адценнем нематы.
Нам мудрасці прыроды не парушыць:
Снег чысцінёю абнаўляе душы
І бласлаўляе іх у шлях святы.

Пусці, зіма, мяне ў свой снежны рай.
Хвілінак пяць мне дай, гадзіну, суткі...
Хай уладарыць ціхі сон бялюткі,
Хай засыпае снегам небакрай.

Груша над абрывам

Кіпела горда над абрывам груша,
Была вясна, і салаўіны ранак
То песціў заварожаныя душы,
То галасіў, бы маладая падранак.

А груша над абрывам гаманіла,
Сцвярджала праўду і жыцця аснову,
Нібыта лёс свой за сябе маліла,
Нібы шукала правільныя словы.

Яна была — у квецені шчаслівай,
І кожная галінка несла шчасце.
І ёй, разумнай, гордай, над абрывам,
Здавалася, не суджана — упасці...

Не быў да грушы вецер літасцівы:
Лёс не заўсёды правільна кіруе.
І, ветрам зваяваная, з абрыва
Упала груша ў бездань ледзяную.

Спявалі птушкі, гаманілі росы,
Ніхто жыцця ні кроплі не парушыў,
Дзень прачынаўся, юны і цвярозы,
Ды не кіпела над абрывам груша,

І не прарочыла дабра і шчасця,
Не атуляла ад душы пяшчотай...
Не ведаем, дзе давядзецца ўпасці,
І думаем, што так бывае... потым.

Прыход дня

Выспеў шэры досвітак у хмарах,
Ціша над соннаю зямлёй.
Сонца промнем даляглад звязала,
Як араты поле баразной.

Страпанулася на небе зорка,
Зразумела: дзень крануў палі.
І на затуманеных пагорках
Росы крышталямі зацвілі.

Выйшаў бусел важна на пакосы,
У прырэччы салавейкі свіст.
Новы дзень нясмелы, безгалосы,
Што напішаш ты на чысты ліст?

Чым ты зачаруеш? Ці акрыліш?
Ты ж філосаф строгі і мудрэц.
Ці з бядою справіцца асіліш?
Сейбіт ты, і хлебароб, і жнец.

У затоках часу ранак спее
Белізной лілеяў на вадзе.
Расцвітае ў туманах надзея,
Што шчаслівы дзень да нас ідзе.

Помнік



Віктар ВАРАНЕЦ

— ...Гэта была ўжо трэцяя пошта, абрабаваная за апошні месяц. І зноў абсалютна цэлыя замкі, неразбітыя вокны і аніякіх слядоў узлому. Быццам нячысцік які пагаспадарыў. Тым не менш, праца ёсць праца. Эксперты пачалі здымаць адбіткі пальцаў з дзвярных ручак, сейфа, шуфлядак. Калегі разышліся апытваць работнікаў пошты, а я па новай пайшоў блукаць па памяшканні. Ад уваходных дзвярэй праз калідор у адзін пакойчык, потым у другі, трэці і да сейфа. Адтуль назад да дзвярэй. І так кругоў пяць зрабіў. Версій нуль. Як раптам каля самага ўваходу ў цёмным вузкім калідорчыку (нават лямпачкі ў ім няма) у сцяне заўважаю нейкую амаль непрыкметную дзірачку. Дастаю з кішэні ліхтарык і пачынаю свяціць. Так і ёсць — нізенькія, ледзь да пояса, дзверы. Ключ начальніцы пошты. Аказваецца, гэта камора для інвентару прыбіральшчыцы, але ёй ніхто не карыстаецца з часоў, як у будынку зрабілі прыбіральню для супрацоўнікаў. Прашу адчыніць. Пусты квадрат прыкладна пяцьдзясят на пяцьдзясят сантыметраў. Павуцінне, пыл, а вось на падлозе ў гэтым пыле выразна бачныя два дзіцячыя сляды. Менавіта з іх мы і раскруцілі ўсю справу. У горадзе быў такі дамушнік Коля-малы — саракагадовы мужчына, рост якога ледзь дасягаў метра дзесяці сантыметраў. Ну і камплекцыя адпаведная. Дык вось, яго прыносілі на пошту ў вялізнай сумцы, адзін злачынца ішоў у залу, другі караўліў ля ўваходных дзвярэй. А Коля хуценька адкрываў каморку, дзе і заставаўся да ночы. Потым рабаваў пошту і праз фортку перадаваў грошы, каштоўнасці з бандэролеў, а пасля і сам вылазіў. Так што пільнасць і прыдзірлівая ўвага проста неабходны для міліцыянера.

Іван Пятровіч Конан скончыў пад апладысменты залы свой выступ і, хутчэй для захавання фармальнасцяў, чым з цікавасці, запытаў:

— Можа, ёсць пытанні?

На дзіва, у другім радзе імгненна ўзнялася рука, і хударлявая дзяўчына ў вялікіх акулярах бойка выкрыкнула:

— У мяне ёсць!

Дырэктарка ліцэя Зоя Паўлаўна незадаволена паглядзела на малую.

— Гэта, Іван Пятровіч, наша актывістка, стараста другога курса Каця Ляпешка. Ну што за пытанне, Кацярына?

— Іван Пятровіч, дзякуй Вам за цікавае паведамленне пра працу нашай міліцыі. Вось вы казалі, што адслужылі ў крымінальным вышуку больш за трыццаць гадоў, багата налавілі злачынцаў за гэты час, прыклады прыводзілі. Цікава, а ці была ў вашай практыцы хоць адна нераскрытая справа, якая, тым не менш, помніцца і цяпер?

Конан усміхнуўся.

— Дзякуй і табе, Кацярына, за пытанне. Я зразумеў, пра што ідзе гутарка. Так, не заўсёды, на жаль, мы імгненна раскрываем злачынства, а вінаватых вядзем за краты. Але ніколі не гавары ніколі. Бывае, што колішняя нераскрытая справа праз дзесяць, пятнаццаць, нават дваццаць гадоў нечакана ўсплывае на паверхню. І мы зноў пачынаем яе раскручваць з самага пачатку. Ну а вынік... Дарэчы, калі вы не стаміліся, я раскажу пра адну такую справу, якая, як і прасіла Кацярына, мне вельмі запомнілася.

Было гэта ў канцы шасцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя. Толькі год прайшоў, як я выпусціўся з юрыдычнага факультэта і пачаў працаваць у Гродзенскім раённым аддзеле ўнутраных спраў. І вось неяк выклікае мяне начальнік аддзела Сымон Іванавіч Галуза.

— Іван, — кажа, — тут з'явіўся ў нас ананімны ліст. Хутчэй за ўсё гэта поўнае глупства, але правераць даведзеную інфармацыю мы абавязаны. Закон ёсць закон. Вось ты і зоймешся гэтым. Даю тры дні, а ў пятніцу з дакладам да мяне.

І працягнуў ліст. Я вярнуўся ў свой кабінет, заварыў кубачак гарбаты і пачаў чытаць.

«Добры дзень, грамадзяне следчыя. Доўга не адважваўся напісаць гэты ліст, бо, з аднаго боку, даруйце, не вельмі люблю вас, а з другога — пабойваўся за сябе. Ніжэй вы зразумееце, чаму. Але днямі дактары сказалі, што жыць мне засталося тыдзень-два... Анкалогія! Дык чаго цяпер баяцца?

Так склалася, што ў час вайны я служыў камандзірам паліцэйскай роты ў Гродне. Што прывяло да такога выбару, расказваць не буду — гэта іншая і досыць сумная гісторыя. Дык вось, у сакавіку 1943 года нам паступіў загад: сумесна з чацвёртай карнай ротай дывізіі СС «Рэйх» ліквідаваць яўрэйскае гета, што мясцілася ў горадзе. Працавалі ўсю ноч. Як вынік — былі знішчаны больш за чатырыста яўрэяў, дзве з паловай тысячы адпраўлены ў лагер смерці Трэблінка. Потым мы пачалі абыход іх кватэр у пошуках каштоўнасцяў, золата. Зондэркаманда, якая падаспела на дапамогу, вырывала ў нябожчыкаў залатыя зубы, пер態трасала адзенне, збірала каштоўныя рэчы. Але прыбытак быў не такі вялікі, як чакалася. І мы вырашылі, што асноўнае багацце яўрэі схавалі ў сваіх дамах. Таму пайшлі на паўторны вобыск, ужо больш шчыльны. І што вы думаеце? Мае хлопцы адшукалі ў доме старога Хейфіца замураваны ўваход у піўніцу, дзе былі роўна складзены брускі золата з кляймом Імператарскага банка Расіі. Як яны туды трапілі, невядома, але хутчэй за ўсё пад час рэвалюцыйнагаператрусу тысяча дзевяцьсот сямнаццатага года, калі рабавалі ўсё і ўсё і хлеб каштаваў даражэй за дыяменты. Золата мы адвезлі ў камендатуру і здалі Гродзенскаму павятоваму камісару, палкоўніку фон Плетцу. За такую знаходку Плетц выдаў кожнаму з нас грашовую ўзнагароду і нават паабяцаў, што мы будзем суправаджаць каштоўны груз у Берлін. А гэта два тыдні шыкоўнага і спакойнага ад вайны жыцця. Час ішоў, але ніхто нікуды нас не адпраўляў.



Фота www.rt.com

У чэрвені 1944 года Саветы пачалі аперацыю «Баграціён». Мая рота была тэрмінова перакінута ў Кёнігсберг, дзе я неўзабаве сустрэў Міколу Харытончыка, які служыў перакладчыкам у фон Плетца і адначасова выконваў абавязкі сакратара. Мы пасядзелі ў нейкім бары, добра падпілі, і тут я ўспомніў пра золата. Што з ім сталася? Харытончык загадкава ўсміхнуўся:

— Памятаеш, чым захапляўся палкоўнік у вольную часіну?

— А як жа, ён займаўся кавальскай справай. Мы яшчэ смяяліся, што цягае за сабой невялікую кузню, як любімую кабету.

— Дык вось, — працягваў Мікіта, — апошнія дзве ночы перад эвакуацыяй Плетц не выходзіў са сваёй кузні і нікога не пускаў туды.

— І што?

— Ён плавіў знойдзенае і канфіскаванае золата.

— І вывез у Германію пры адступленні?

— Не, я ўцякаў разам з ім у бронетранспарцёры. Апроч двух чамаданаў, вельмі лёгкіх па вазе, ён нічога з сабой не вёз.

— А ў самім бронетранспарцёры не мог схаваць?

— Таксама не, — адказаў Мікола. — У Варшаве мы пераселі ў цягнік, пакінуўшы машыну ў гарнізоне. Хто ж кіне столькі золата?

— Тады дзе ж яно? — збянтэжана запытаў я.

— Думаю, што палкоўнік пераплавіў яго ў нешта і схаваў у памяшканні камендатуры.

Прыкладна праз гадзіну мы развіталіся з Міколам, і больш я яго ніколі не бачыў. У тым жа Кёнігсбергу абзавёўся дакументамі прымусова высланага на працу беларускага вяскоўца, дачакаўся прыходу рускіх і вярнуўся ў Саюз. А далей дваццаць гадоў штодзённага страху быць выкрытым, пазнаным... Перад смерцю я хацеў бы хоць крыху аблегчыць сваю грэшную душу. Таму і напісаў вам пра золата...».

Такі вось ліст. Праверку ўсёй гэтай інфармацыі я вырашыў пачаць з наведвання будынка былой камендатуры. Цяпер у двухпавярховым цагляным доме знаходзіцца аддзел жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Перш за ўсё мяне цікавіў падвал. У суправаджэнні слесара Дорахава, які працаваў тут з першага дня арганізацыі службы, мы пачалі падарожжа па неабсяжнай па памерах падвальнай тэрыторыі. Дорахаў аказаўся вельмі гаваркім чалавекам з нядрэннай памяццю для сваіх гадоў. Пакуль спускаліся па лесвіцы ўніз, стары не даваў мне сумаваць.

— Калі ў сорак чацвёртым вызвалілі Гродна, мяне прызвалі ў армію. Якраз васямнаццаць гадоў стукнула. Ну, зразумела, спачатку СМЕРШаўцы праверылі, што рабіў у акупацыі, папалохалі трохі, але не моцна. Ну і даверылі біць фашысцкую гадзіну. На прызыўным пункце далі абмундзіраванне, сухі паёк на два дні і павялі разам з іншымі навабранцамі на вакзал. І тут адзін з нашых хлопцаў заўважыў каля разбітага бомбай дома сваю знаёмую. Імгненна скочыў да яе са строю і — наступіў на міну. Выбух! У вачах агонь, а потым суцэльная цемра. Ачуняў ужо ў шпіталі. Усё як бы нічога, а кісць левай рукі як лязом зрэзала. Але, як сказалі дактары, яшчэ пашчасціла: трох з калоны адразу забіла, чацвярых параніла. Вось і ўся мая служба. Камісавалі па поўнай. Пасля выпіскі прыйшоў сюды працаваць. Спачатку без адной рукі цяжкавата было, але неяк патрохі прызвычаіўся. Далі нам вось гэты будынак. Добры, прасторны, а тут яшчэ ў падвале кузню знайшлі. Кажуць, нямецкі камендант забаўляўся. І добрая такая кузня. Мы яшчэ гады тры яе выкарыстоўвалі: ці падкову якую зрабіць, ці вечка, засаўку. Дзе тады купіш? А жалеза навокал хапала. Так і выжывалі. Ну а потым разабралі кузню і выкінулі.

Мы агледзелі ўважліва адзін пакойчык, другі. Я нават прастукаў некаторыя прасценкі. Дорахаў з цікавасцю назіраў за мной, пакуль нарэшце не вытрымаў:

— А што ты шукаеш?

— Ды ёсць інфармацыя, што тут дзесьці можа быць схованка.

Тады стары дастаў са свайго слясарскага чамаданчыка, што трымаў у руцэ, малаток, падышоў да адной са сцен і моцна па ёй стукнуў. Адна з цаглін правалілася ўнутр. За ёй другая, трэцяя.

— Вось твая схованка.

У мяне ад здзіўлення ледзь мову не адняло.

— Адкуль вы, Мацвей Іванавіч, ведалі пра схованку?

— Ну дык я яе ўчора сам заляпіў. Бачыш, яшчэ і не прыхапіла як след.

Я ажно сеў на падлогу.

— А навошта заляпілі?

— Учора прыходзілі два вашыя супрацоўнікі, папрасілі дапамагчы разабраць сцяну. Затым дасталі адтуль дзве скрыні і пагрузілі ў машыну. Добрыя людзі. Нават на бутэльку далі.

У маёй галаве замітусіліся думкі. «Значыць, у лісце напісана праўда. А золата з'ехала з нейкімі фашысцкімі недабіткамі».

Стары сеў каля мяне.

— А што ты так занерваваўся?

— Дык гэта ж былі не нашы, а немцы. А ў скрынях ляжала нарабаванае золата.

Мацвей Іванавіч са спачуваннем паглядзеў на мяне і нават правёў шурпатай рукой па галаве.

— Маладзенькі ты яшчэ, вось і любіш розныя казкі выдумляць. Якія ж гэта немцы, калі Пятроўна аднаго з іх ведае з малога?

Я недаверліва паглядзеў на дзеда.

— Яна якраз прыбірала ў калідоры, калі гэтыя міліцыянты са скрынямі ішлі. Зразумела, ніякай увагі на яе не звярнулі, а Пятроўна, баба цікаўная, добра іх разгледзела. Потым і пытаецца ў мяне: «А што тут Андросік робіць?».

— Андросік — гэта імя ці прозвішча?

— А Бог яго ведае. Я не перапытваў.

Ужо праз гадзіну я ведаў адрас Пятроўны і стаяў каля дзвярэй яе драўлянага дома. Адчыніла мне сталага ўзросту жанчына неверагодных памераў. Здаецца, шырыня яе цела перавышала вышыню.

— Вам каго? — строга запытала кабета.

— Васілісу Пятроўну Кавальчык. Я з міліцыі.

Васіліса Пятроўна была жанчынай адзінокай і таму надта гаваркой. Пра што і каго я толькі не пачуў за дзве гадзіны нашай размовы! Але асноўная інфармацыя была атрымана. Андрон Сямёнавіч Хоўтан, злодзей, п'яніца, двойчы сядзеў у турме, жыў праз два дамы ад Кавальчык. Тыдні тры як аб'явіўся ў горадзе пасля чарговай адсідкі. Больш Васіліса Пятроўна па справе нічога дадаць не магла.

Падзякаваўшы за дапамогу міліцыі і гарбату з абаранкамі, пакрочыў я да дома Хоўтана. Яшчэ больш старая, чым у Кавальчык, крыху пахіленая ўбок будыніна цудоўна характарызавала яе гаспадара. Плот вакол дома адсутнічаў, двор зарос пустазеллем, затое былі прыадчынены ўваходныя дзверы (а, можа, яны і не зачыняліся...). Я ціхенька прасачыўся ў дзвярны праём і аказаўся адразу на кухні, калі так можна назваць пакойчык, у якім апроч печы, стала і аднаго крэсла больш нічога не было. Затое на падлозе адразу кідалася ў вочы паднятае вечка люка. Я асцярожна зазірнуў уніз. Нейкія неразборлівыя галасы, цені на сценках, шорганне. Дастаў пісталет, ліхтарык і асцярожна пачаў спускацца па лесвіцы. Падвал быў досыць вялікі па сваіх памерах. Можа, і пад усім домам... У дальнім куце стаялі два мужчыны і нешта перабіралі, схіліўшыся

над ледзь асветленымі газоўкай скрынямі. Я ўзняў пісталет і гучна крыкнуў:

— Рукі ўгору!

Адзін з мужчын спалохана азірнуўся і тут жа ўзняў рукі. А вось другі раптоўна кінуўся на зямлю, перакаціўся да нейкіх бочак і стрэліў. Балюча апякло плячо. Чыста механічна націскаю раз за разам спускавы кручок пісталета. У адказ чую кароткі енк. Не апускаючы зброі, падыходжу да ляжачага. Куля трапіла яму якраз у пераноссе. Імгненная смерць. Паварочваюся да другога бандыта. Той адразу пачынае верашчаць на дзіва тонкім галаском:

— Не страляйце! Прашу, пашкадуйце! Я больш не буду!

І, абхапіўшы галаву рукамі, упаў на калені.

На допыце Андросік, а гэта быў менавіта ён, расказаў, як два тыдні назад да яго завітаў незнаёмец, прынёс гарэлкі, закускі і, назваўшы прозвішча агульнага знаёмага, прапанаваў выпіць. Андросік, зразумела, згадзіўся. А ў застоллі Іван, так прадставіўся госць, выклаў план захопу дзвюх скрынь у памяшканні ЖКГ, паабяцаўшы ніадрэнныя грошы. Што ў тых скрынях, Андросіку не сказаў. Аперацыя прайшла гладка: пасведчанні міліцыянераў, якія прынёс Іван, адыгралі сваю ролю. Скрыні вырашылі схаваць у доме Андросіка. Днямі Іван дзесьці адсутнічаў, а па вечарах шчыльна пераглядаў усе паперы, раскладаючы па розных мяхах. Андросіка ж папярэдзіў, каб маўчаў, інакш пасадзіць на пяро. Грошы абяцаў прынесці праз пару дзён.

Паперы аказаліся нямецкім архівам яшчэ з ваенных часоў. З гэтага ж архіву стала вядома, што Іван — Іван Іванавіч Зубаў, камандзір роты зондэркаманды вядомага забойцы, пакаранага Нюрнбергскім судом, капітана Золенгера.

Я адляжаў два тыдні ў бальніцы і вярнуўся на службу. Атрымаў павышэнне ў званні і грашовую прэмію. У мітусні штодзённых спраў пра золата неяк і забыўся. А ў 1995 годзе неяк у кнігарні на вочы трапілі мемуары былога нямецкага афіцэра палкоўніка фон Плетца. Мне падалося гэта прозвішча вельмі знаёмым, пакуль не ўспомніў, што так звалі каменданта Гродна, у якім пачыналася мая службовая кар'ера. Купіўшы кнігу, засеў за чытанне. У адной з частак Плетц падрабязна апісаў і знаёмыя мне падзеі: як паліцэйскай ротай было дастаўлена золата ў камендатуру, як імкліваe наступленне Савецкай Арміі не дало магчымасці яго вывезці з Гродна. І тады палкоўнік прыдумаў выйсце. У хляве за камендатурай валяўся помнік Іосіфу Сталіну, які немцы знялі з пастамента ў Гродне, калі акупавалі горад. Помнік быў з чыстай бронзы, таму яго не разбілі, як іншыя, а па загадзе каменданта перанеслі ў хлеў для кавальскіх забаў. І вось помнік спатрэбіўся. Плетц выліў з канфіскаванага золата руку Сталіну, па-майстэрску схаваўшы каштоўны метал пад слоем бронзы і «састарыўшы» яго. Палкоўнік слушна разважаў: Саветы, вярнуўшыся ў Гродна, абавязкова паставяць Сталіна на пастамент. Дзе той і дачакаецца вяртання нямецкіх войскаў, у чым палкоўнік не сумняваўся. Але гісторыя распарадзілася інакш…

Як вы разумееце, ужо назаўтра я быў у Гродне. Ішоў па вулачках старажытнага горада, і пачуццё настальгіі па мінулым усё больш мяне ахоплівала. А вось і знаёмы будынак, у якім, на дзіва, па-ранейшаму размяшчалася ЖКГ. Старшыня аддзела спярша вельмі здзівіўся маёй цікавасці да Сталіна, але потым патлумачыў, што помнік Сталіну быў дэмантаваны яшчэ ў 1956 годзе і прыкапаны на тэрыторыі ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Успомнілі пра яго ў 1992 годзе, калі вельмі спатрэбіліся грошы на гаспадарчыя патрэбы. Помнік з іншым каляровым металаломам адправілі на металургічны завод у Жлобін на пераплаўку.

Што было далей, старшыня не ведаў, паколькі ў той час тут не працаваў. Вось так і скончылася гэтая залатая гісторыя.

Водціск быцця



Аляксей КАРПЕНКА

***

Маўчыць паўсонны далягляд,
Прыціснуты нябёсным краем.
Размыла ўсе шляхі наўгад
Гадзін і дзён нуда густая.

Няхай бязглузда страшыць ноч,
Хай дзень праменнем не акіне —
Цяпер не збочыш. Кроч ды кроч
Па вузкай вымаклай сцяжыне.

Плячу — не цяжкі груз крыжа.
Аддаца шляху — на магіле.
Не азірайся. Хай імжа
Хавае пройдзеныя мілі.

***

Чуеш — час праходзіць мерна?
Чуеш водгук моў памерлых —
Жытніх злакаў шэпт размыты
Ціха ўплёўся ў ветра ніць.

Крочыць час хадою ўпартай.
Ці гатовы ты, як балты,
Ў нетрах земляў старажытных
Мову продкаў з цішай зліць?

***

З зорных промняў будуй Камелоты,
З мрояў — вычварных вежаў слупы.
Напляваць, што запэцканым ботам
Лёс іх стопча ў скрываўлены пыл.

Хай спрабуе даніштчыць жывое
У душы, растрапанай ушчэнт.
Час замесіць слязой і крывёю
Новых мрояў і дзеяў цэмент.

***

Хвілі сумуюць, і дні не ў гуморы,
Цягнуць часу жгуты.
Ные гітарным тупым пераборам
Свету абрыдлы матыў.

Час і прастора ад болю, няйначай,
Звіліся ў скрутку адным.
Повязь з найлепшымі днямі аплачаш
Енкам распятай струны.

Больш не шукай у напеве ссівелым
Мрояў сляпых міражы.
Тонкай зламанай свячой адгарэлі,
Зніклі ў дрыготкім дажджы.

Змыюцца тыдні чародкамі кропель,
Вылыюцца ў змоўклы кацёл.
Сонны мінуўшчыны выдзьмуты попел
Болей не стане жыццём.

***

Куды, бядак, у прыцемках ішоў?
Згусцее сінь, зальe шляхі старыя.
Ад дзённых жахаў Бог цябе накрые
Нябёсаў перакуленым кашом.

Дарма шукаў між дзённае маны
Спакой душы ды спакушаўся нечым.
Сляпому паратунак у адным —
Забыць святло, разліўшыся ў цямрэчы.

***

Шукае рысаў скончаных аловак.
Шукае дзень змяркання і начы.
Старонак белізну шукае слова,
Каб у спакой радком перацячы.

А хтосьці на Парнас па ім даплысці
Спрабуе — і дарма шукае плынь.
Тупік быцця з сябе шукае выйсця.
…А я штодня шукаю напамін

У водгуках, вятрах і небакраі
Аб горадзе сівым і не старым,
Дзе між адбіткаў ты мяне шукаеш
У роўнядзі застуджаных вітрын.

***

Парахнеюць часу латы.
Сон сцірае думак вязь.
Белы свет пустой палаты
Сам сабе панок ды князь.

Ціша змушанага міру.
Хвіль размытых стыне мазь.
Сам сабе суддзя і вырак.
І бясплодных думак князь.

***

Народзін верша не чакай
У дні навязлага спакою —
Старонкі брудам паўрадкоўяў
Дарма абмахвае рука.

Хай верш народзіцца ў пару,
Калі рашуча не да вершаў.
І крыкам сам сябе давершыць —
Распудзіць клопатаў гару.

Пляваць, што ўздыхаў не стае
Між дзён — вар'яцкіх карагодаў.
У кволай музы прымеш роды
І на каленяў двух сталe.

***

Час заб'е сябе ўтрапёна



Фота www.pictures.net

Колкім джалам скарпіёна —
Колам выгнуты ўваскрэсне —
Перальецца ў свой працяг.

Паміж тыдняў вязкіх, прыкрых
Застывае часу выкрык —
На закрэмзанай паперы
Водціск хворага быцця.

***

Вакол цябе — не твой апошні свет.
Няма з малых пераpаджэнняў выйсця.
І ты не той, якім пампрэзі калісьці.
Нязменнай не знайсці ў сярод планет.

Твой свет мінулы і ўчарашні ты,
Прагглынутыя плынню інкарнацый,
Асуджаныя перанараджацца
За днём штодня — да вечнай нематы.

Змяняцца да жаданняў, мрояў, сноў,
Да жыццядайнай плазмы ў русле венаў…
Дзіцячы грэх — лічыць сябе нязменным —
Забудзь. І паўтары назаўтра зноў.

***

Шалеючы без прычынаў,
Сусвет праваліўся скопам
У розум — акно расчыненае,
Бы ў прагную глотку раскопу.

Фігурамі,
формамі,
фарбамі
Кіпела быццё строката,
Ірвалася ў розум аслаблены,
Крышыла замкі і краты.

І зносіла
плынню
вар'яцкай,
Шалёнай дурной ракою…
Але пакрысе, не знянацку,
Наблізіўся цень супакою.

І ў смутку заплакаў бязмежным
Над мёртвым суцішаным вірам,
Што белая панна у снежні
Шаўковай пятлёю забіла.

І песняў
вар'яцкіх
водгук
Падхопіць адна завея.
Апошні прамень знямоглы
Бадай да Каляд дакалее.

***

П'янай хваляй Дняпра ахрышчаны,
Ветрам стылым, тугім спавіты.
Сэрца слёзы па кроплі вышчыміш
На паперы малочнай пліты.

Хай зліюцца, застынуць, згорнуцца
Пырскі радасцяў, ісцін, болю.
Між адценняў губляюць розніцу,
Нараджаюць суцэльны колер.

Хай кладуцца на памяць горам,
Спевам, следам нябачных войнаў —
Як адчайная чырвань чорным,
Да нямой чарнаты чырвоным.

***

Жаданы велічны сусвет
Спрабуй абняць старой душою —
А ён зірне ў адказ пустою
Вачніцай з мошкамі камет.

Блукай між зораў, каб страчаць
Абдоймы мілае пустэчы.
Каго суцешыць, што залечыць
Амаль памерлы, збіты час?

Маўчыць гадоў сівая твань
У цемрадзі ўсяленскай комы.
Няўлоўны, срэбны, ртутны момант
Між друзу вечнасці дастань —

Мільгне між цемрадзі нямой
Сваім крывым адлюстраваннем, —
І сам тваім сусветам стане,
Пустэчу поўнячы сабой.

Спецзаданне

Урывак з аповесці



Янка ТРАЦЯК

Антось убачыў на сваім падворку тры постаці, адна была знаёмай — таварыш старшына. Падумаў, што партызанская нахабшчына не мае межаў: сярод белага дня ў адкрытую… А калі хто заўважыць і данясе немцам? Тады што?!

Яшчэ дзве постаці Антось заўважыў за гумном і дзве каля Пуценькавай хаты. Хата свяціла пусткамі — савецкі актывіст Пуценька знік бясследна ў першыя дні вайны; за ім знікла і жонка яго — Марта.

— Пройдзем у хату, — прагаварыў старшына. — Дзела есць.

— У хату не пойдзем, пойдзем у паветку, — прапанаваў Антось.

Калі што якое, дык Антось будзе мець хоць нейкі аргумент, маўляў, прыязджалі людзі з мястэчка, хацелі купіць сячкарню.

— Не, — запярэчыў старшына, — не спецыяліст я па паветках лазіць. Пойдзем у хату.

— Яно дык так, якія ж спецыялісты, партызаны сена не ядзяць, а там жа, у паветцы, адно сена, — адзначыў сумна Антось.

— Але цяпер і ў хаце нічога няма.

— Не хвалюйся, тое, што нам трэба — мы знойдзем, — даволі спакойна прагаварыў старшына, не звяртаючы ўвагі на Антосеву рэпліку.

Зайшлі ў хату. З дзяцей былі толькі меншы Чэсік з суседскім Мікіткам (сынам Шаргуна).

— А дзе твае дзеўкі? — спытаў старшына.

— Якія дзеўкі?

— Дарослыя! Не аднеквайся — я сам бачыў. І нам добрыя людзі пра цябе шмат чаго цікавага расказалі…

— Няма ў мяне дзевак, ёсць толькі дзеці…

— Дзеці, кажаш? Ты старэйшую толькі што адмазаў ад вывазу ў Германію, і меншай гады ўжо падыходзяць… Мы ўсё ведаем. Мы нават ведаем тое, чаго немцы не ведаюць. Дык дзе дзеўкі?

— А няма, у мястэчку недзе…

— А калі будуць?

— А я не ведаю, могуць у сваякоў заначаваць…

— Так, дзеці, а ну пайшлі вон адсюль! — закамандаваў старшына, і калі Чэсік з Мікіткам выйшлі, звярнуўся да Антося:

— Нам спяшацца няма куды, у нас спецзаданне… Зараз сходзіш і прывядзеш сваіх дзевак.

— Таварыш старшына, — умяшаўся ў гутарку другі партызан. — У мястэчка пускаць яго нельга — там нямецкі гарнізон, хто ведае, што за чалавек… Вернецца з гарнізонам…

— Тагды будзем тут чакаць!

— Дык, пан старшына, а навошта дзеўкі? Вы ж гаварылі пра нейкае дзела…

— Фашызм аказаўся вельмі моцным арэшкам, і барацьба з ім зацягнулася не на жарты. А тут і дзела такое, што без дзевак тваіх аніяк нельга.

— Не, начальнік, вы дзевак маіх сюды не блытайце — малыя яшчэ. Калі што, можа, я спатрэблюся?..

— Ты?! — старшына рассмяяўся. — Там, дзе патрэбны дзеўкі, ты не справішся… Га-га-га!

— Не, так справа не пойдзе, неяк ужо самі вы там з фашызмамі сваімі разбірайцеся, без дзевак маіх…

— Разбяромся з усімі… А тут без дзевак тваіх аніяк, — быццам бы больш угаворваў, чым тлумачыў старшына. — Панімаеш, заданне ў нас баявое ад камандзіра нашага: знайсці яму верную саратніцу, вось такую Надзею Крупскую, якая і гаспадыняй магла б быць добрай і… ну, што тут казаць… і каб каханкай, і палюбоўніцай магла б быць спрытнай… Такое вось няхітрае дзела…

— Ах вось яно што! — ахнуў ад нечаканасці Антось. — Дык вам прасталытка патрэбная, а пры чым тут мае дзеўкі…

— Во, во, лытка якраз і патрэбна! А дзеўкі твае мне запалі ў вочы, я думаю, што і камандзіру спадабаюцца.

Тое, што дзеўкі яго западаюць у вочы мужчынам — гэта і сам добра ведаў Антось. Калі ўжо сам ксёндз барунскі кінуў былў вока, дык што ўжо гаварыць пра астатніх.

— Яшчэ, вось што, хазяін, — гаварыў старшына. — У цябе выхаду няма гэтак жа, як і ў тваіх дзевак: іх забяруць у Германію, і будуць там немцаў абслугоўваць у публічных дамах… А я прапаную выхад: быць баявой сяброўкай краснага камандзіра. Ты адчуваеш, дзядзька, розніцу?

— Абслугоўваць краснага камандзіра?

— Але ж розніца якая!

Антось чамусьці розніцы не адчуваў.

— А калі дачка не захоча быць сяброўкай твайго камандзіра? — спытаўся Антось у надзеі хоць на якую-небудзь чалавечнасць і разуменне ў такіх няпростых адносінах між жанчынамі і мужчынамі.

— Мы забяром яе сілай, а хоча яна ці не, ці ты гэтага не хочаш — нас не цікавіць… А там камандзір хай сам з ёй разбіраецца. У нас спецзаданне, панімаеш? За невыкананне спецзадання ва ўмовах ваеннага часу можна схлапатаць вышку, панімаеш?

Антось заўважыў, што старшына гаварыў добрай трасянкай, пры тым стараўся звяртацца да яго на беларускай мове, а да сваіх калегаў — на расейскай. З гэтага можна было зрабіць высноў, што старшына калі не быў з тутэйшых, дык быў з усходняй Беларусі, але ад гэтага Антосю лягчэй не рабілася.

Дочкі былі ў Старых Ракавічах. Разам з маці і меншымі дзецьмі капалі бульбу на цесцевым полі. Казалі, калі скончаць трохі раней, дык прыйдуць дахаты, а калі не — застануцца там начаваць. Даць ім знаць, каб не прыходзілі — зараз немагчыма. І Антосю заставалася толькі адно: глядзець у вакно на вуліцу і чакаць. Чаго чакаць?..

Дзеці, Чэсік з Мікіткам, знайшлі занятак на падворку: ладзілі сабе каламажкі. А пасля агледзеліся і кінуліся былі ўбок Старых Ракавічаў, і Антось абрадаваўся іх кемлівасці. Але напярэймы ім з вялікага куста бэзу выскачыў партызан і перагарадзіў дарогу. Яны нешта тлумачылі яму, нешта расказвалі, паказвалі, але далей бэзавага куста ён так іх і не пусціў…

— Таварыш старшына, ты кажаш — сілай, гвалтам, але што ж гэта за каханне такое, гвалтоўнае. Што ж гэта за любоў такая, калі бабу гвалтам — аніякай радасці, згадзіся…

— А ты хочаш, каб каханне ўзнікла? Каб красны камандзір тут з кветкамі пахадзіў, серэнады пад вакном паспяваў? Ты гэтага хочаш? — перабіў Антося старшына.

— Не, серанадаў тут не трэба… Мае дзеўкі непісьменныя, неідэйныя, да таго ж каталічкі… неспрактыкаваныя… Камандзір будзе вельмі незадаволены такім выкананнем спецзадання…

— А камандзіру абы баба была…

— Слухай, начальнік, а вось, каб так прыйшлося табе, ты сваю дачку аддаў бы для такой ролі?

— Для мяне, як для бацькі, дачка з красным камандзірам — гэта быў бы вялікі гонар! — ускліknуў старшына, і відаць было, што ён і сапраўды ганарыўся б гэтым.

Не, відаць, разлічваць на нейкую чалавечнасць з гэтымі людзьмі не даводзіцца. А што рабіць? Чаму гэты свет такі няроўны?.. Ці гэта час такі… Чаму аднаму што ў радасць — другому ў гора?.. І дзе той выхад шукаць?..

— А ну-ка глянь, ці не твае там бабы цягнуцца? — перабіў Антосевы роздумы старшына.

З Багданоўкі, па дарозе праз Бутрымаўшчыну, няспешна ішлі тры жаночыя постаці. Вядома, што Антось іх пазнаў, і сэрца яго затахтала ў грудзях.

— Ну, твае?

— Я не магу пазнаць, — прагаварыў Антось. — Я нізкі на вочы.

— Затое я пазнаў. Вунь тую, вышэйшую, забяром, — старшына меў на ўвазе старэйшую дачку Стэфку.

Антось напружана глядзеў у вакно і чакаў.

— Ты глядзі — і меншая нічога. А ці не забраць нам абедзвюх? — гаварыў няведама каму старшына, гледзячы ў вакно. — У камандзіра выбар будзе…

Ну, вось і ўсё, падумаў Антось, паспее ён толькі адзін раз даць у гэтую ненавісную і абрыдлую морду, і ўсё для яго скончыцца.

Ён ужо і павярнуўся, каб добра размахнуцца, але тут убачыў, як адзін партызан разам з Чэсікам, быццам напярэймы, шпарка беглі ў хату, і гэтак жа шпарка, а адзін голас, з парога аб'явілі:

— Немцы!

— Дзе? — спахапіўся старшына.

— І там, і там, — у розныя бакі развёў рукою партызан.

— Значыць, ужо акружылі, гáды, — злосна прагаварыў старшына. — Нехта данёс…

— Ну не я ж, — адгукнуўся Антось.

— Так, сяржант, слушай каманду: всем быць на сваіх пазіцыях: хлеў, гумно, куст, лапухі; замаскіравацца і не выдаваць себя ні в коім случаі. Не страляць, што бы тут не прэісходзіло. Адкрываць агонь толькі пасля майго выстралу. Усё, перадай астатнім. Я буду тут, у хаце.

Пакуль партызаны разбіраліся з пазіцыямі, Чэсік вышмыгнуў на вуліцу і пабег насустрач жанчынам.

— Во, смаркач, і не стрэліш! — злосна прагаварыў старшына ўслед малому.

І бачыў Антось праз вакно, як Чэсік дабег, нешта ім казаў, а пасля ўсе рэзка павярнулі назад і подбегам прыспешылі ў Багданоўку. Антось уздыхнуў з палёгкай: адно ліха на гэты раз пранесла другое.

— Калі не падзеля нас з'явіліся тут немцы, дык немцы прыедуць і паедуць, а мы застанёмся, — прагаварыў старшына. — Далёка твае дзеўкі не ўцякуць.

— Каб жа так, — засумняваўся Антось. — Вы прыходзіце і адыходзіце, а немцы пасля разборкі чыняць. Невядома з якімі мэтамі яны і цяпер наляцелі. Калі што, старшына, дасі мне пісталет, адстрэльвацца будзем разам.

Старшына паглядзеў на Антося, але нічога не сказаў.

Вёску ніхто не акружаў. Два матацыклы з калясакамі каціліся праз Бутрымаўшчыну, а невялікі бронетранспарцёр на добрай хуткасці ляцеў з Клышкаў. За ім сунулася крытая брызентам машына. Каля хаты Шаргуна адна і другая тэхніка спынілася. З вакна хаты добра праглядвалася ўся панарама падзеяў, якая адбывалася на суседнім падворку. Некалькі салдатаў і паліцэйскіх (старшына налічыў дзесяць чалавек) акружылі хату, а пасля вывелі ўсю сям'ю на падворак: старая маці, жонка Аксіння і пяцёра дзяцей — старэйшаму сыну было каля пятнаццаці, наймалодшай дачуркі — шэсць. Камандаваў гаўляйтар. Было відаць, як ён нешта напачатку гаварыў, а пасля пагладзеў на гадзіннік.

— Даў, відаць, хвіліну на роздум, на прызнанне, — прагаварыў старшына. — А ў чым справа, ты, дзядзька, не ў курсах?

— Гаспадар недзе знік з канём і возам, — неахвотна прагаварыў Антось, — а чуткі пайшлі, што ён у партызанах — на яго коні партызаны на заданні ездзяць у суседнія вёскі…

— А, вось яно што… За сувязь з партызанамі, значыць… А што-небудзь яго жонка і дзеці пра партызанаў ведаюць?

— Адкуль?..

А на падворку Шаргуна падзеі разварочваліся вельмі хутка. Гаўляйтар біў Аксінню кулаком у твар і нешта крычаў. Дзеці стараліся акружыць маці, але паліцэйскія раскідвалі іх у бакі рукамі і нагамі, а два немцы дабівалі прыкладамі. Заўважыў Антось, што паліцэйскія былі не тутэйшыя. Старая маці Шаргуна кінулася на калені перад гаўляйтарам, але ён ударыў яе нагой так, што тая злегла нерухома. Урэшце двое паліцэйскіх увішна пачалі здзіраць адзенне са старэйшай дванаццацігадовай дзяўчынкі і павалаклі за вугал хаты.

Антось не вытрымаў:

— Старшына, ты бачыш, што робіцца, ну, зрабі што-небудзь!

Старшына маўчаў, старшына быў спакойным.

— Вы, партызаны, маць вашу! — абурыўся Антось. — За гэты час мог бы хто-небудзь зайсці з боку гаю, даць чаргу з аўтамата, напалохаць немцаў, хоць здзеку і гвалту гэтага не было б… Старшына!

— Дзядзька! У нас ёсць загад: у аніякія сутычкі з немцамі і паліцаямі не ўступаць, тым больш, што мы на спецзаданні…

— На спецзаданні… курву знайсці для камандзіра…

— Да, спецзаданне… пад носам у самага немца, сам бачыш — гэта тое, што языка на фронце даставіць у штаб арміі… А ты тут такімі словамі кідаешся…

Антось рэзка рвануўся да дзвярэй — яму прыйшла шалёная думка пра карабін, які даў яму на схованку швагер Яська, перад высылкай у Сібір. Карабін той быў прыхаваны ў застрэшку гумна. Да гумна можна было прайсьці неўпрыкметку. Але да Антося гэтак жа рэзка кінуўся старшына з рэвальверам у руцэ і перагарадзіў дарогу.

— Выстрелю, — вельмі спакойна і пераканаўча працадзіў ён скрозь зубы.

А між тым на падворку Шаргуна крывавая бойня падыходзіла да свайго завяршэння. Гаўляйтар махнуў рукой аўтаматчыкам, сказаў нешта паліцэйскім. У крытую машыну паліцаі закідвалі акрываўленых дзяцей; туды ж запхнулі і Аксінню. Пасля адзін паліцай прыпёр карністру, прабег вакол хаты. Полымя рэзка шуганула ўверх. Немцы некалькі хвілін пастаялі, пасля няспешна ад'ехалі да гасцінца і там затрымаліся, пакурылі, спакойна пазіраючы на вогнішча над вёскай.

У хаце першым загаварыў старшына:

— Дзядзька, калі б мы адкрылі агонь па немцах, дык заўтра такое полымя было б над кожнай хатай, і ад вёскі засталіся б адны галавешкі і абгарэлыя чалавечыя косці…

— Дзевак зараз я сваіх не знайду, каб нават і сам моцна захацеў, — сказаў Антось. — Што я магу зрабіць? Можа, узамен табе нешта прапанаваць… карову, свінню, курыцу?

— Ты што, дзядзька, здзекуешся: я камандзіру заместа дзеўкі свінню падсуну?

— Тады прабач! Мне трэба падысці на папялішча, бачыш, людзі сабраліся.

— Ідзі! — дазволіў старшына. — Толькі май на ўвазе, калі што — ты на прыцэле…

Калі Антось вярнуўся ў хату, старшына сядзеў за сталом і як не ў чым не бывала жвава ўплятаў капусту з варанай у лупінах бульбай.

— Можа, дзе гарэліца ёсць? — пацікавіўся ён, убачыўшы Антося.

— Чамярыцы б табе, — абыякава адказаў Антось. — Але няма ні таго, ні другога…

— Ну а там што? — спытаў старшына, запальваючы папяросу і ківаючы ўбок папялішча.

— Там усё пагарэла… Старую заўтра хаваць будзем…

— Заўтра, кажаш… А твае заўтра аб'явіцца?

Антося пачынала разбіраць злосць:

— Слухай, старшына, а што, свет клінам сыйшоўся на маіх дзеўках?

— Ну, глянулася яна мне, спрытная такая, ладная… Такая камандзіру была б вельмі да спадобы… Нейкі ты, дзядзька, не згаворлівы… А мог бы ж зрабіць так, што ты ўсёй сям'ёй прыляціш да нас у лес, шукаючы паратунку ад немцаў… У Мілідаўшчыне добрыя людзі хлеба папрасілі ў гаспадара, а ён выскачыў з абрэзам, шум падняў… ледзь уцяклі…

— І што? — не зразумеў Антось.

— Што? Пасля ў яго хата згарэла… Хто падпаліў, невядома… А каб каго застрэліў з партызанаў, дык і вёска магла б уся згарэць… Немцы… Няшчасны выпадак…

— Ах вось ты пра што!

— Вот іменна! У цебя нету выбару…

Антось маўчаў.

«І ён пра выбар. Але чаму так складваецца, калі ён сапраўды не мае выбару? І 22 чэрвеня, калі яго з сям'ёй вывозілі ў Сібір, не было выбару, але пачалася вайна, і сям'я засталася…»

— У цебя і шанцу няма, — гаварыў старшына. — Вайна… Ты ведаеш, дзядзька, мне прыйшла ў галаву вялікалепная ідэя: мы зараз, як добра прыцямнее, пойдзем з табой да тваіх дзевак, дзе б яны не былі, і адтуль пойдзем разам да камандзіра. Калі хочаш, можаш і ты разам пайсці, пазнаёмішся з зяцем… Гэта ж вялікалепна…

— Каб ты апрогся, вялікі лепнік, разам са сваім камандзірам, — спакойна прагаварыў Антось.

Старшына, было відаць, не зразумеў, і перапытаў:

— Ну дык як, пойдзем?

«А калі яго прыкончыць тут, — разважаў Антось, — зненацку патэльняй па галаве, пасля неўпрыкметку можна сысці з хаты, узяць дзяўчат, дзяцей і… куды? У лес, да партызанаў? Ці, можа, у Крэва, да летувісаў, да немцаў? І яны цябе пашкадуюць, прылашчаць… Дзяўчат, можа, і прылашчаць, а патрэбен ты ім з дзецьмі?..»

— Чаго маўчыш? У шмоньцы тарчыш, — перабіў яго роздум старшына.

І тут раптам Антось аж падскочыў, акрылёны ідэяй:

— А што, калі пашукаць у вёсцы дабравольцаў, для якіх спаць з камандзірам партызанскага атрада было б вялікім гонарам?! І гэтым уносіць свой уклад у абшчэнароднае дзела ў барацьбе з праклятымі ворагамі…

— Так, добра гаворыш, як агітатар. Але далей што? — зацікавіўся прапановай старшына. — Нам што — абвесткі развесіць?..

— Ёсць у вёсцы прыгожыя дзеўкі, але на людзі не паказваюцца, бо былі актывісткамі, камунаркамі. Вось такая за чырвонага камандзіра, калі што, і жыцця свайго, альбо, як поп кажа, жывата свайго, не пашкадуе…

— Ну, дзядзька, ты і сказануў… Жывот камандзіру ані ў якім разе не патрэбны — не да жывата зараз. А вось наконт камсамольцаў-дабравольцаў — гэта можа быць… А я думаў, што ты, дзядзька, трохі тупаваты…

— І камандзір будзе задаволены… бо яна ж будзе яму і ў рот, і ў куды хочаш глядзець…

— Мне б такую! — узрадаваўся старшына. — Абы толькі мордай выйшла!

— Можна пашукаць і з мордай, і з лыткай не брыдкай, і кумпяк не абы як…

— Так, так, бліжэй да цела: гэта ж — варыянт. Імя, прозвішча, дзе жыве?

— Не, пачакай, зараз прыйдзе мой старэйшы хлапец, хай ён напачатку перагаворыць з гэтымі дзяўчатамі, і калі будзе згода, наладзім вам сустрэчу ў дамоўленым месцы, каб ніякага гвалту, ніякага крыку, каб толкам усё было.


Фота www.russian7.ru

Пецьку доўга чакаць не прыйшлося. Антось коратка выклаў яму сутнасць справы:

— Падыдзеш да Зінкі, не — лепш да Клавы. Скажаш так: «Савецкі баявы ахвіцэр, камандзір партызанскага атрада, шукае сабе баявую сяброўку, якая дзяліла б з ім увесь цяжар суровых партызанскіх будняў у бязлітаснай барацьбе з ненавісным ворагам нашай неабдымнай савецкай Радзімы…».

— Стой! — перапыніў старшына. — Гэта скажу я, толькі мне запісаць трэба… Мне пасля камандзіру дакладваць… А ты, хлапчына, скажаш, што з ёй хоча сустрэцца адзін чалавек з Вялікай Зямлі па вельмі важнай справе, і не больш… Разумееш?

— А мне дык што… Як скажаце, так і зраблю. Усё? — Пецька з гатоўнасцю накіраваўся да дзвярэй.

— Калі Клава будзе згодна, прыйдзеш і даложыш, а Клаве скажаш, хай лямпу не запальвае, — дадаў Антось.

Клава прыехала аднекуль з Савецкай Беларусі. Перад вайной выйшла была замуж за Эдзіка Савіцкага, мясцовага хлопца з суседняй вёскі, і, можа, добра жылі б, калі б не трапіла Клава на вочы чырвонаму оперу Цэрберу. І неўзабаве Эдзік Савіцкі стаў асабістым ворагам Цэрбера, а пасля паступова «пайшоў на павышэнне»: абвясціў яго Цэрбер ворагам народа. А пасля Эдзік даведаўся, што ён яшчэ з'яўляецца англійскім, кітайскім і японскім шпіком. Дайшло да таго, што аформіла Клава з Цэрберам свайго мужа (каб не перашкаджаў ажыццяўляць савецкую змычку на вёсцы) этапам у Сібір. І закруціліся яны ў распусце, бо ведама: абодва актывісты — шмат агульнага. А калі пачалася вайна, знік недзе Цэрбер, кінуўшы яе адну на волю лёсу. І лёс гэты быў бы для яе пры немцах незайздросным як камсамолкі і актывісткі, калі б не адзін мясцовы паліцай, які стаў да яе заляцацца і ўзяў яе пад сваю паліцэйскую апеку. Так і атрымалася, што жыла Клава цяпер адна, і баяцца ей не было чаго, апрача партызанаў, якія могуць не зразумець Клавінай здрады савецкаму оперу Цэрберу. Ды, па вялікаму рахунку, ёй ўсё роўна было, з кім дзяліць цяжар вайны: з паліцаем ці з чырвоным камандзірам. Праўда, з чырвоным камандзірам яно можа і лепш, больш патрыятычней і, можа быць, больш перспектыўней…

Калі добра сцямнела, павёў Пецька старшыну на сустрэчу з Клавай. Тая, як толькі даведалася, з якой мэтай да яе завіталі партызаны, так і кінулася з радасным піскам старшыну на шыю…

Антось хутка справіўся з гаспадаркай і меў намер прылегчы і адпачыць, хоць і ведаў, што нармальнага адпачынку не будзе і наўрад ці ўдасца заснуць. Дзень сёння быў страшным. І як сябе не супакойваў Антось, але на душы, на сэрцы было цяжка і прыкра.

У гэтую ноч яны засталіся з Пецькам у хаце ўдваіх, астатнія там, у Старых Ракавічах. Пасля таго, як саветы сям'ю цесця арыштавалі і вывезлі, у яго хаце нейкі час жылі прыезджыя спецыялісты па «будаўніцтву савецкай дзяржавы». Цяпер хата пуставала і пераначаваць было дзе. А так яно, можа, і спакайней.

Сон не ішоў, і раптам Антось пачуў, як асцярожна рыпнулі дзверы ў сенцы, і там пачалася нейкая валтузня.

— Тата, вы ў хаце? — шэпатам спытаў Ясь.

Яго меншыя хлопцы, Чэсь і Ясь, неслі ў хату акрываўленага Мікітку.

Антось запаліў лямпу. Мікітка нешта трызніў. У малога, відаць, было прастрэленае плячо. Антось паслаў Яську па крываўнік і трыпутнік, а сам, з Чэсем, як умеў, прамыў рану вадой. Пасля ў шафе знайшлі нейкія стужкі паркалю і перабінтавалі плячо.

— Заўтра на раніцы збегаеце па маці, трэба, каб яна паглядзела, — разважыў Антось. — А зараз — спаць.

Зразумела, што пасля ўсяго, што адбылося, было не да сну. Трызніў Мікітка, шапталіся між сабою хлопцы, і Антось доўга ляжаў з адкрытымі вачыма. А пасля ўсё прыціхла, і Антось амаль што быў задрамаў, як тут бразнула клямка і аднекуль здалёку данёсся знаёмы і абрыдлы голас:

— Хазяін, ты гдзе?

«Што гэта, — падумаў Антось, — начны кашмар ці ўсё яшчэ дзённы працягваецца?..»

— Тата, чалавек пагаварыць хоча, — Пецька злётку тузануў яго за нагу.

— Каб ты, сынок, ведаў, як гэты чалавек мне сёння надаеў сваёй гаворкай, дык задушыў бы яго па дарозе, — спакойна прагаварыў Антось, падымаючыся з ложка.

— Всё шуціш, шут, ну-ну, — не пакрыўдзіўся старшына. — Ты б відзеў, дзядзька, як яна мне на грудзі кінулася!.. Камандзір будзе задаволены… Я, так думаю, што і нам нешта перападзе…

Антось не адразу зразумеў, пра што гутарка. А старшына паказаў рукамі некалькі пахабных рухаў і гэтак жа пахабна рассмяяўся.

— Чаго хацеў, старшына? — Антось прыглядзеўся і ўбачыў, апрача Пецькі і старшыны, яшчэ дзве постаці.

— Першае: ты яшчэ раз скажы, як там: «Савецкі баявы камандзір партызанскага атрада шукае сабе…». Каго шукае?

— Прасталытку, — падказаў Антось. — Дык жа знайшоў ужо, чаго ты яшчэ хочаш?..

— Чаго знайшоў? О, там у цябе было добра сказана, усё роўна, як у партызанскай клятве, як там?

— Пецька, нагадай яму, я ўжо і сам не помню.

— Шукае баявую сяброўку, якая дзяліла б з ім увесь цяжар і нягоды суровых партызанскіх будняў. Здаецца, так, — успомніў Пецька.

— О! Суровых партызанскіх будняў. Слязу прашыбае. Трэба запісаць! — старшына дастаў з нагруднай кішэні шматок газеты і, слюнявічы аловак, пачаў пісаць.

— Старшына, я ж цябе прасіў больш у хату не заходзіць, — нагадаў Антось.

— Ну што за народ! Ніякай прыязнасці да гасцей. Што значыць не заходзіць? — абурыўся старшына. — Мы з табой, дзядзька, адно важнае спецзаданне камандзіра выканалі, засталося яшчэ адно…

— Усе астатнія заданні цяпер выконвай з Клавай, а мяне не чапай, — катэгарычна заявіў Антось.

— Засталася свіння! — амаль урачыста прагаварыў старшына.

— Якая свіння? — не зразумеў Антось.

— Ты ж казаў, магу даць карову, свінню, курыцу… Казаў?

— Дык жа я так, адчэпнага, казаў…

— Вось адчэпнага і давай. Толькі я тут сам сабе падумаў, а навошта нам курыца, праўда, хлопцы?

— Не, не! Курыца нам не патрэбна, — заківалі галовамі ў знак згоды хлопцы.

— Свінню давай! А не, дык будзем шукаць тваіх дзевак, не сёння, дык заўтра, паслязаўтра… пакуль не знойдзем… Праўда, хлопцы? — старшына кіўнуў сваім калегам. — А мы іх абавязкова знойдзем! Знойдзем, а там хай камандзір разбіраецца…

— Ты, гэта, старшына, сур'ёзна?.. Вам, што — рабіць няма чаго, як толькі гарэм для камандзіра збіраць?

— Якія жарцікі, вайна ідзе! А дзевак мы і сабе можам пабраць! Свінню давай, я табе сказаў! Нам вяселле камандзіру трэба будзе спраўляць.

— Дык няма ў мяне свінні…

— А калі знойдзем?.. Ты што, забыўся: «За сопротівленіе советской власті в условіях военного времені — расстрэл…». Пазорная смерць! Свінню давай! — апошнія словы старшына амаль што выкрыкнуў.

— Дык жа няма!

— Ты не понял! — і старшына рэзка ўдарыў Антося ў твар.

«А і сапраўды могуць забіць, — падумалася Антосю. — І хоць разумеем адзін аднаго без перакладчыка, але гэта ж такія чужыя людзі, як і немцы, як і "акаўцы", як усе тыя, хто праходзіў праз яго падворак, і тут ужо не важна, куды яны ішлі… Чакаць ад іх літасці — марная справа».

— Дык дзе свіння? — чуў ён над сабою голас старшыны. — Давай лепш ціха, па-добраму, каб ніхто не бачыў нас тут, каб не паўтарылася заўтра тое, што бычылі мы сёння на падворку Шаргуна. Давай, давай, табе ж лепей будзе без свінні! Совесць будзе чыстай…

— У хляве, справа, за драўлянай перагародкай…

— Во дзе народ! Пакуль у морду не дасі, нічога не даб'ешся, — задаволена прагаварыў старшына. — Пайшлі! А ключы?

— Пеця, дай ім ключы…

Пецька зняў са сценкі ключ.

— Сякеру! — зноў запатрабаваў старшына.

Пецька з-пад лавы выцягнуў сякеру.

— Во, цяпер пайшлі, — старшына кіўнуў галавой сваім ваякам.

— Пецька, будзь у хаце, я пайду, — Антось памалу падняўся з падлогі. — Толькі, старшына, мяне не ўблытвайце, я буду стаяць воддаль, каб не падумалі, што сам прывёў і аддаў.

— Стой дзе хочаш, — абыякава прагаварыў старшына.

Трэба прызнаць, што свінню яны забралі акуратна, без аніводнага лішняга стуку, свіння нават не піскнула, як цюкнулі ёй абухом па галаве, а потым чатыры чалавекі лёгка яе панеслі за гумно і ўскінулі на павозку. Відаць было, што добрыя спецыялісты былі яны ў гэтай справе. Антось да іх не падыходзіў, толькі не ўтрымаўся, калі ўбачыў партызанскі вазок і каня, — і падышоў бліжэй. Хоць ноч не была светлай, але немагчыма было не разглядзець плямістага гнядога коніка, падвязаную банцікам грыву і белую зорку на ілбе. Па гэтай зорцы Шаргун і каня свайго празваў Зоркай…

Антось шпарка адышоў ад каня, бо да яго сунуліся хлопцы са свіннёй, і стаў каля гумна. Апошнім ішоў старшына, і калі ён параўняўся з Антосем, ён ціха прагаварыў:

— Убачыш там можа дзе Шаргуна, раскажы, як было…

— Не раскажу…

— Чаму?.. Хай ведае чалавек…

— Забілі яго, — выбухнуў старшына і пайшоў да воза.

— Як? Хто? За што? — залпам выкрыкнуў Антось, але старшына нічога не адказаў.

Даганяць яго і паўтараць пытанні не было сэнсу.

Зазірнуць за далягляд



Ігар ШАРАЙ



Фота Антона Кірыка

* * *

Ну вось і развіталіся з даўгамі.
Ніхто ні ў чым не вінны, далібог.
Не блытаюся болей пад нагамі,
Хоць і хацеў прыснуць ля Вашых ног.

Сказалі, што вясна, вясна ўздыхнула.
А я — што хутка стрэціm халады...
І доля, як заўсёды, падманула.
Ды ў гэты раз, здаецца, — назаўжды.

* * *

Улляне

Выбачай, жыву — нібы астрожнік,
Бы адзінай хваляю жыву.
Ды й дагэтуль звабна і трывожна
Зноў і зноў трымацца на плыву.

Сонца ацвярэзіць аблачынку
І не дасць азмрочыць новы дзень.
Штосьці ты яшчэ прысніш, дзяўчынка,
Пасярод сталеючых надзей.

Потым, уваскрэснуўшы ад сненняў,
Аж да дна душу ператрасеш.
Толькі б не зазнаць супакаення
Тых, каго спакоем абаўеш.

Спі, мая гарэза, да світання.
Ночку, далібог, не абысці.
Да сустрэчы заўтра, да спаткання.
Да наступнай сцежачкі ў жыцці.

* * *

А можа, я прыгрэюся каля Вас?
Мо думаў: не суцешыць, дык накорміць?
Баюся слоў — то вымаўлю не ў час,
То неабходных не магу прыпомніць.

Што за трывога дыхаць не дае,
Якая ноч між намі праляцела?
Баюся сноў — Вы скардзіліся ў сне,
А я ізноў апраўдваўся няўмела.

Скажыце, прападаю ні за грош?
Скажыце, кім міжволі станаўлюся?
Баюся Вас, але ж усё-ткі больш
Сябе, непрадказальнага, баюся.

* * *

Уцячэнт разбіць увесь набытак,
Адгараваць, адгаманіць.
Маё жыццё — вучнёўскі сшытак,
Дзе ад памылак рабаціць.

Уцячэнт усё, што замінае
Мне зазірнуць за далягляд!
Бяда бясследна не мінае,
Хай не вяртаецца назад.

Хай шлях абраны не разбэсціць,
Каб не разменьваць на грашы
Доўгачаканай гэтай песні,
Што нараджаецца ў душы.


* * *

Як ты магла? Як мог?
Мо, гэта — пакаранне:
З усіх зямных трывог
Мы выбралі расстанне.

Дрыжыць сярод снягоў
Чый воклік ледзьве чутны?
З усіх зямных шляхоў
Мы выбралі пакутны.

І роспачы не збыць,
Пазбыўшыся палёту.
Няўжо і нам карціць
Прывеціць адзіноту?

Што ж, кожны з нас мастак:
Як можам, так і пішам.
Ды цягнецца няўзнак
Душа да зор і вышай.



Андрэй СТАЛЬМАКОЎ

* * *

Ад хаты да леса праз поле і яр
Сабраўся ў дарогу — у ноч гаспадар.
Завесіў акенца, свячу загасіў,
Паленца да брамкі з сасны прыхіліў.

Старая бярданка вісіць ля спіны.
Стаяць у цішы векавыя дубы.
Знаёмы з дзяцінства мясціны навокал:
І рэчка, і луг, і па лесе дарога.

Пралеглі сцяжыны мужчыны няпроста:
Па цемры прайсці трэба многія вёрсты,
Туды, дзе на лоне лясоў і балот
Атрад партызанскі збірае народ.

Не можа хавацца ў ліхую гадзіну,
Калі іншаземцы знішчаюць Радзіму,
Калі над народам пакуты і здзек, —
Не можа спакойна пражыць чалавек.

Таму і скрануўся ў мароз і па сцюжы
З жаданнем адным: хутчэй ворага
здужыць.
Абраў сабе сам ён такую дарогу:
Адпомсціць чужынцам за слёзы і гора.



Сяргей ВАГАНАЎ

З «НАРАЧАНСКАГА СШЫТКА»

Крыж

Яны ў крыжы драўляным бачаць бервяно.
У металічным — пуд металалому.
Не Ён і не Яна.
Яны — ЯНО
У курапацкім жаху крыжаломным.

Але не зломлены наш Курапацкі Крыж!
Не ададраць ад каранёў адвечных.

ЯНО, ты чуй, у пекле як гарыш?!

Бо ён нязломны — Беларускі Крыж
З пакутнай Памяці і костак чалавечых.

Па дурніцы

Прывітанне, Купа! Купа дарагая!
Звонкая «кукушка»-паравоз!
Аркадзь Куляшоў.

Я помню, як рухавы цягнічок
Вазіў у пашчу пушчы па дурніцы.
Папросіш машыніста прыпыніцца,
Ды й у багун. Да болю — у вачох.

З купіны на купіну мяккі крок,
Дзе чуецца балота ўздых і выдых,
Што з багны вызваляе пухірок
Вады з паветрам зносінаў няспынных.

І ў галаве дурэе дурнап'ян.
Хаваючы кустоўя ў белых рызах,
Павіснуў перадранішні туман
На ягадах, ад прахалоды шызых...

А ўвечары ідзеш па шпалах зноў
І прыкладаеш зноў да рэйка вуха,
Бы да прасторы падаеш пазоў,
Каб адгукнулася далёкім колаў гукам.

І чуеш, як напружана гудзе,
Нібы струна, пад цягнічком рухавым...
Ці блізка ён, ці ён далёка дзе?
Ці ён нідзе...

Пайшоў па зніклых шпалах
Гадоў, што засталіся ў небыцці,
Якім наканавана толькі сніцца.
І дзякаваць таму, што ў жыцці
Быў цягнічок,
І Нарач,
І дурніцы...

У буру

Прачнуўся...
Нібы цмок схаваўся ў коміне —
Рыпіць, вішчыць, пяе, мармыча нешта.
То ўчорашняй начной віхуры рэшта
Ад ранку ў сон грукоча да мяне...

А я хутчэй да возера! Хутчэй!
Туды, дзе разгарнуўся бурай ліпень.
Дзе цемра апраметная з вачэй
Сплывае ў нарачанскі белы кіпень.

Дзе хваля хвалю новай хваляй б'е,
Жадаючы навыперадкі бегчы.
Змяёй шыпячай на пясок паўзе,
Каб там, зусім знясіленая, легчы...

Аднекуль раптам чуецца здалёк
Надрыўны гук маторнай, быццам, лодкі...
У непагадзь каго ж завабіў Бог
Да бойкі з ім — смяротнай і салодкай?

І бачу, як ажно з-пад Чараўкоў,
І сам, як бог, — сівы, ў цяльняшцы сіняй,
Ляціць над хвалямі Міхась Лынькоў,
На ўсёй кіпучай Нарачы адзіны.

Чаму ж яму не любы ранні сон?
Ці ён, што ветразь той, шукае буру,
Каб сатварыць з яе літаратуру —
З «Міколкі...» аж да «Векапомных дзён»?

А мо з дзіцячай радасці ці здуру
Адчуць імкнецца Волі смак і стогн?

Хто ведае...
Хоць да самога дна
Ўглядайся ў Час, пакуль вякі не скралі,
Нічога не пабачыш. Бо здаўна
Адказ схаваўся ў нарачанскай хвалі...

Дранка

З Мацеем сёння будем дзерці дранку!
Ужо ляжыць, чакае бервяно.
Як ні салодка спіцца нам уранку,
Пад самы дах узведзена гумно.
А як прыгожа сталася ў двары!
Па крокваx шпацыруе промень сонца.
І круглякі ў смалістыя муры
Пакладзены трывала, шчыльна, моцна.
Бы на вякі...
І я дапамагаў
Мацею адбудоўваць гаспадарку:
Пілу з сякерай спрытна падаваў...
А сення...
Сёння будзем дзерці дранку!
...Трашчыць, нібы жывое, бервяно.
Паблісквае скаба лязом жалезным...
То будзе ў Купе новае гумно,
Пасля вайны пастаўленае першым!

Пандэмія

Яго хавалі — у зачыненай труне.
Для справаздачы — плюс.
Ад чалавецтва — мінус...
А ноччу прымаркоцілася мне,
Як з-пад зямлі каронавірус вырас.
Атрутны пах. Раскошная лістота.
З нябёс — паліў бясконцае хлусні...
Якая прыцягальная істота!
Ты паспрабуй што іншае сасні.

А ранцай успомніш, што нікога,
Нікога ля труны той не было...
Ці то нябожчыка хавалі.
Ці то Бога.
Ну а пасля — усё ў нябыт сплыло...

Быць альбо не быць

А мы ўжо там былі, дзе не былі.
І зноўку там, дзе не былі, мы будзем.
Няўжо ва ўлонні матухны-Зямлі
Мы назаўжды, дзе мы былі, забудзем?!

Няўжо ў Сусвету памяці няма?
Няўжо ў тумане забыцця збялелым
І мы, і наша матухна-Зямля
Ў Сусвеце згінем камянём змярцвелым?

Дык ці былі мы там, прыйшлі адкуль?
І там, куды пайсці наканавана?

Заўжды былі і будзем мы, пакуль
Крывавіць нас Жыцця жывая рана...

Пра герб

Адкуль ва ўлады гэткі сверб —
ізноў «мяняць» савецкі герб?
Ды ведаюць бары і гоні
Адзін нязменны герб — «Пагоня».

Пра шлях

Я веру: мы ніколі ўжо не спынімся.
І пройдзем шляхам непарушнай еднасці
Ад плошчы, што пад вежай Гедымінаса,
Да шматпакутнай плошчы
Незалежнасці.

Жаночыя гісторыі



Алена ВЕШТОРТ

Запальнічка

Яна прыязджала цягніком, і кожнага разу ён сустракаў яе з нейкімі падарункамі. Аднойчы заявіўся з галінкай атрутна-сініх, штучнага колеру хрызантэмаў. Бровы яе міжволі папаўзлі ўгору — спрадвечная немагчымасць стрымаць эмоцыі, — але, пазіраючы на шчаслівы твар і расцягнутыя ва ўсмешцы тоўстыя вусны, усміхалася ў адказ.

— Не падабаюцца? — спытаў ён.

Так, густу яму бракавала. І з выгляду быў падобны на пабітага жыццём сабаку з адданасцю ўваччу: вочы са знешняга боку былі крыху ссунутыя ўніз, — з пляскатым, як у баксёра, носам і са шнарам на лбе. Але ён называў яе ласкавым імем Запальнічка...

У душы ягонай назапасілася шмат незапатрабаванай пяшчоты і дабрыні. Жонка, аса з выгляду і па характары, была засяроджана выключна на сваёй асобе і даўно стала яму чужой. А тут, зусім выпадкова, сустрэлася гарадская жанчына, якой патрэбна была энергія цяпла і спагады, якою поўнілася ягоная душа. А яшчэ самотнікаў, хаця і жылі на адлегласці, злучыла пачуццё гумару, лёгкага ды праставатага, і прага жыццёвых прыгод.

Узімку яны часцяком сустракаліся на лецішчы. Аднаго разу ён ехаў туды, каб прапаліць печку перад яе прыездам, і машына захрасла ў снезе.

Не адчуваючы пад сабой ног, бегаў у лес, ссякаў яловыя галіны, падкладаў пад колы. Урэшце даехаў, спехам запаліў у печы і пагнаў легкавік на чыгуначную станцыю. А яна тым часам ужо блукала ў цемры, парна дыхаючы і выглядаючы ў змроку знаёмую постаць. Ведала: ён з'явіцца, бо абодва былі людзьмі даверлівымі і з пачуццём такой адказнасці, якая межавала з дурнотай. Аднойчы давялося спыніцца ў мясцовым гатэліку, і яна зарэгістравала нумар на сваё імя — каб ягоная жонка пра тое не дазналася. Жонка, на шчасце, не дазналася. Дазнаўся яе муж, з якім на той час ужо спрабавала развесціся. Дзяжурная ў гатэлі, асоба з высокай маральнай адказнасцю, не паленавалася знайсці тэлефонны нумар мужа і пазваніць.

А яшчэ яны ездзілі на рыбалку. «Мабілы» там часцяком не працавалі, і яму даводзілася лезці на дрэва, каб злавіць «сетку» і датэлефанавацца да жонкі. Папярэдзіць, што застаецца на рыбалцы з начоўкай. І пакуль ён аднойчы сядзеў на дрэве, узяўся вялізны шчупак, якога яна выхапіла з вады голымі рукамі. Баялася, што той сарвецца з кручка...

Не, яны не былі парай двух чобатаў. Ні ў якім разе. У яго былі гумовікі рабацягі, капальніка меднага дрота, а ў яе туфлікі з італьянскай скуры, якія носяць далікатныя паненкі. І яны выдатна разумелі, што іх сувязь часовая. Яна жыла надзеяй, што сустрэне некага больш вартага, а ён, адчуваючы гэта, зрываўся ў запоі з начнымі тэлефанаваннямі і п'янымі румзамі. Нарэшце яна прыехала апошнім разам і сказала: «У мяне ёсць іншы». Жонка якраз была ў ад'ездзе, ён накрыў стол і закаціў дыскатэку 80-х. І так, уперамежку са слязьмі і смехам, віном і танцамі, яны развіталіся.

Нейкі час яшчэ тэлефанаваў. Але недзе праз год яна выдыхнула ў слухаўку: «Хопіць з мяне п'яных званкоў».

Потым доўга не магла прызвычаіцца, што цяперашні мужчына засынае першым. Той, які называў яе ласкавым імем Запальнічка, засынаў пасля яе і заўсёды казаў: «Ты спі, а я буду глядзець на цябе і любавацца».

Будатрад

Пасля трэцяга курса медінстытута Ганна вырашыла запісацца ў студэнцкі будаўнічы атрад. Хлопцы з будатрада, трыццаць чалавек, мусілі ўзводзіць вялікую абору непадалёку ад Капыля, і ім патрэбны быў лекар і кухар. Інтарэсы камандзіра атрада, якому карцела зэканоміць грошы, узяўшы адну асобу замест двух, і Ганны, шукальніцы прыгодаў, супадалі.

Прыехаўшы на месца разам з некалькімі будатрадаўцамі, якіх паслалі ўпарадкаваць інтэрнат, Ганна, якая за ўсё жыццё смажыла адно яечню на матчынай кухні, задумалася: як і чым яна будзе карміць гэтую будатрадаўскую плойму?

У першы ж дзень камандзір Дзіма прывалок тушу кабана, паведаміўшы, што не зашкодзіла б паесці адбіўных са свежыны. Ганну ахапіў адчай, аднак праз хвілю, згадаўшы курс анатоміі, узяла навостраны камандзірам нож і стала ўпраўляцца з кабаном, аддзяляючы мяса ад костак.

Адбіўныя не надта атрымаліся. Калі іх смажыла, дык падгарэлі. І хаця пяцёра хлапцоў голасна яе суцяшалі, настрой быў сапсаваны.

Потым пацягнуліся працоўныя будні. Пад'ём быў а пятай раніцы. Калі, перабіваючы салодкія сны, абуджаўся будзільнік, Ганна прыціскала яго да грудзей і яшчэ некалькі хвілін спала. Але неўзабаве, схамянуўшыся, мусіла падымацца і, пазяхаючы, сунулася на кухню. Уключала святло і назірала, як заспетыя за разгрызаннем костак пацукі таксама сонна валакліся ў свае спраты. На пару з Ганнай на кухні працавала другая кухарка, якая гатавала абеды для рабацяг, якія таксама нешта будавалі непадалёку. Пасля яе гаспадарання даводзілася перамываць мясарэзку ды посуд, які яна ніколі не мыла.

Праз стому Ганна ўжо і не лічыла дні, аднак хутка прызвычаілася да суворай будатрадаўскай рэчаіснасці. Адно, што не давала спакою, — гэта стравы, якія гатавала і якія смачнымі нельга было назваць. Але вось у адзін з выхадных дзён яе наведала сяброўка з Менска. Алеська прыехала не з пустымі рукамі, а прывезла дапаможнік — вялізную таміну ў чорнай скуранай вокладцы пад назвай «Усё пра смачную і карысную ежу». 1948-га года выдання. А яшчэ распавяла, як з яечных жаўткоў і сталовай лыжкі каньяку згатаваць смачнае печыва. Гартаючы кнігу, Ганна дакорліва ківала галавой. Пра многія інгрэдыенты прыгатавання страў яна нават не чула, і думала пра тое, што Алеська магла б прывезці кухарскую кнігу з больш простай рэцэптурай.

Акрамя кухарскай кнігі Алеся прывезла інтрыгоўную навіну. Як высветлілася, сяброўка надоечы пазбавілася цнатлівасці. Дапамог ёй у гэтым сябар дзяцінства. Той вучыўся ў Піцеры і прыехаў на вакацыі.

— Усё гэта, скажу табе, даволі прыемна, — апавядала сяброўка, злёгку мружачы міндальныя вочы. А затым спытала: — А што ў цябе з асабістым жыццём? Відаць, нармалёк, бо тут столькі паклоннікаў...

Увагі з мужчынскага боку Ганне і сапраўды хапала. Але ўвесь час не пакідала думка, што хлопцаў цікавіць не зграбнасць яе постаці, а тое, калі, нарэшце, яна пачне іх карміць прыстойнай ежай. Навіну, якую паведаміла сяброўка, сустрэла з лёгкай усмешкай, аднак адчуванне, што тая апярэдзіла яе ў такой важнай справе, непрыемна казытнула самалюбства.

Пасля ад'езду Алескі абедзенны рацыён узбагаціўся, і падзякі ды кампліменты наведнікаў сталоўкі сталі гучаць усё часцей. Тады і прыйшла пара разняволіцца і прыглядзецца да кампліментшчыкаў.

Першым, на каго звярнула ўвагу, быў камандзір Дзіма. Гэты быў добра складзены кучаравы бландзін. Да таго ж, меў прыгожыя рысы твару: светлыя вочы пад густымі брывамі, круглы падбародак, амаль рымскі нос і далікатны абрыс вуснаў пад акуратнымі пшанічнымі вусамі. Яшчэ б дадаць расточку — і быў бы ваяр легіёнаў Юлія Цэзара.

Апрача камандзіра, які раз-пораз, нібыта няўзнак, яе абдымаў, былі яшчэ два залётнікі: неразлучныя сябрукі, якіх жартам звалі Труляля і Траляля. Яны ўвесь час парываліся дапамагаць ёй на кухні. Мылі посуд, чысцілі бульбу і рэзалі кіслыя яблыкі для кампоту. Яны нагадвалі Ганне спрытных і вясёлых шчанюкоў.

Урэшце, паглядзеўшы на супернікаў, «рымскі легіянер» пайшоў у рашучы наступ і аднойчы ўначы атрымаў поўную перамогу. Дзіўна, але начная прыгода Ганну не надта каб уразіла, і яна пераключыла ўвагу на аднаго з «шчанюкоў». На той час ёй патрэбна была ўвага і пакланенне, а не любошчы на рассохлым інтэрнацкім ложку.

Гэтая схільнасць да рамантызму далася ў знакі. Лагодны «шчанюк» неўзабаве ператварыўся ў агрэсіўнага мужа. Аднак і пакрыўджаны «рымскі воін» аказаўся не на вышыні і распавёў праз пару гадоў навапечанаму мужу — хто ў Ганны быў першым.

Стамбул

Усё пачалося з недарэчнасці: Ірэна спазнілася на свой самалёт на Менск. І вось калі яна, устурбаваная і крыху напужаная, выйшла з будынка аэрапорта імя Атацюрка, ёй сустрэўся турак з вішнёвымі вачыма і з тонкай цыгарэтай у бяскроўных вуснах. Як высветлілася, калісь ён вучыўся ў Баку і без праблем гаварыў па-расейску. Турка звалі Мустафа, ён ляцеў у той самы Баку і прапанаваў Ірэне засяліцца, у чаканні наступнага рэйса, у гатэль.

Пакуль уладальнік вішнёвых вачэй прымаў душ, Ірэна глядзела на размытыя смугой абрысы Стамбула і чарціла пальцам на шыбе свой маршрут. Ад пункта А — дванаццаціпавярховага гатэля пры аэрапорце імя Атацюрка, дзе іх пасялілі ў пракураным і няўтульным нумары, — да пункта Б — горада-героя Менска. Настрой быў трывожны. Ці варта было засяляцца ў нумар з незнаёмым усходнім чалавекам? Да таго ж, за вакном церусіў дождж, які канчаткова псаваў настрой. І яна вырашыла пайсці на рэцэпцыю і ўзяць сабе асобны нумар.

Ні ліслівыя манеры Мустафы, ні яго прыемныя інтанацыі (сапраўдны тэнар), ні жэстыкуляцыя прыгожых рук з нядбайна падгорнутымі манжэтамі кашулі яе не ўзрадавалі. У Ірэны была дакладная інтуіцыя, і яна з першага позірку ведала — чаго варты чалавек. Увечары наступнага дня яна паляцела дахаты, але, нечакана, надышоў час перапіскі ў Фэйсбуку. Мустафа хітра падвёў яе да думкі, што ён сур'ёзны і сумленны мужчына. Праўда, крыху нудны. Але ж сапраўдны джыгіт і не павінен быць веселуном і блазнам. І душа хутка размлела ад усходняй ветлівасці. Бо на адлегласці гэта выглядала вельмі прывабна. І вось, каб пакаштаваць смак турэцкай слодычы з імем Мустафа, яна другім разам выправілася ў Турцыю.

Абдымкі джыгіта былі прахалодныя. Апынуўшыся ў ложку, Ірэна зразумела, што цуду чакаць не даводзіцца. І калі засынала, падумала: усё можа выправіць раніца. Чалавек, магчыма, стаміўся — і ўсё адбылося занадта хутка. Але раніцай працягу не было. «О, не-не!» — выдыхнуў Мустафа, адкінуў Ірэніну руку і рашучым крокам рушыў у ванны пакой. Ён нагадваў жабянё з мультыку. Вялікае чэрава; энергічна задзёртае ўверх падбароддзе нарцыса; вузкая талія; шырокія і тлуставатыя плечы. І, галоўнае, маленькі віслы азадак. Гэты азадак і даў ходу наступнай думцы: «Няўжо ёй цяпер давядзецца глядзець на ўсё гэта, і няўжо гэты самаўпэўнены экзатычны тыпус з маланкава-ацэньваючым позіркам цёмных вачэй завалодае ёй?».

Ірэна тады і ўявіць не магла, што абаяльны па меркаваннях шматлікіх фэйсбучных сяброўвак мужчына надоўга захрасне ў яе жыцці. І потым, праз тры гады, яна сама сябе вінаваціла за сваю недарэчную даверлівасць, якая межавала з дурнотай.

Вярнуўшыся з Турцыі, яна пайшла да варажбіткі. Тая практыкавала таро і запэўніла, што Мустафа і ёсць той самы мужчына, пра якога марыць жанчыны. Карты паказалі: усходняму прыгажуну ў жыцці не надта шанцавала, але калі яго падтрымаць, дык напярэдзе іх абодвух чакае вялікая будучыня.

Дзякуючы раскладу карт, Мустафа прыехаў у Менск і атабарыўся ў яе кватэры.

Ірэна апекавалася здароўем свайго абранніка, спрабавала ўладкаваць на працу і цэлымі гадзінамі слухала аповеды пра стварэнне хай і невялікага, але даволі прыбытковага бізнесу. Пры гэтым усходні госць бавіў час эпікурэйца, смалячы тонкія цыгарэты і штогадзіны п'ючы згатаваную па-ўсходняму — у меднай турцы — каву. З працай нічога не атрымалася, і ён узяў на сябе цяжкія абавязкі хатняга кухара.

Аднойчы Мустафа ўгаварыў злятаць у Стамбул. Пазіраючы на горад маякоў, сіняй смугі, вострых водараў, крыху крывабокай Святой Сафіі і самавітых котак, зразумела, што яны не паедуць далей бліжэйшага гандлёвага цэнтра. Так і надарылася. Там, сярод людскога гармідару і непралазных, павешаных бясконцым шыхтом апранахаў, Мустафа мераў нейкія ружовыя порткі і жоўтыя кашулі і казаў, што заўсёды марыў менавіта пра такое жоўта-ружовае адзенне. Мост паміж Еўропай і Азіяй, дом-скарабей скульптара Мехмета, раён Султан-ахмет, дзе яна хацела набыць цемна-сінюю керамічную талерку «румі-хатаі» (пра гэта прачытала ў турыстычным аведніку) — так і засталіся ў марах.

Пасля вяртання са Стамбула яна зноў пайшла да знаёмай варажбіткі. Карты не абяцалі нічога добрага. Па дарозе дадому набыла ў шапіку газету з аб'явамі і знайшла здымную кватэру.

Увечары, калі Мустафа вярнуўся са свайго «скандынаўскага» шпацыру — з лыжнымі палкамі ў руках, — і пайшоў, як звычайна, у душ, яна хуценька сабрала ў валізу яго мэтлахі і ціхенька вынесла ў калідор.

Ірэна тады і ўявіць не магла, што абаяльны па меркаваннях шматлікіх фэйсбучных сяброўвак мужчына надоўга захрасне ў яе жыцці. І потым, праз тры гады, яна сама сябе вінаваціла за сваю недарэчную даверлівасць, якая межавала з дурнотай

Сказ пра Кіджандон–II

Фантастычнае апавяданне

Сяргей БЕЛАЯР

Старшыня Сцяпан Цевель вельмі моцна не хацеў пакідаць «Бальшавіцкі ўгар» на апеку свайго першага намесніка Арцёма Пухныша: «мажор» менш за ўсё падыходзіў на ролю кіраўніка калгаса. Вось толькі рабіць было няма чаго: другі «першы намеснік» Алавян пакаціў з чарговым вар'яцкім праджэктам вяртання сябе любімага ў вялікую палітыку ў сталіцу, сакратарка Лізачка сядзела на бальнічным з тэмпературай, механік Марда быў заняты экстраным рамонтам. Старшыню тэрмінова выклікалі на селектарную нараду ў суседні раён. З удзелам Самога.

— Сустрэнеце высокага госця, Арцём Баніфацьевіч, і пакажаце яму наш калгас і Бульбянку. Але толькі добрае — каб стварыць у вачах сусветнай супольнасці станоўчы вобраз Рэспублікі для народа.

— А яно ёсць? — першы намеснік слухаў старшыню з адным бесправадным навушнікам «Apple AirPods» у вуху. Нават за два метры была чуваць расійская папса: драў горла ўлюбёнец састарэлых матронаў, «падкаблучнікаў» і дробных зладзеяватых чыноўнікаў Нікаля Баскаф.

— Што мы, горшыя за іншых? — абыякавасць першага «першага намесніка» раздражняла старшыню, аднак выгнаць Пухныша ў шыю Цевель не мог — бо той быў прызначэнцам «сур'ёзнага чалавека». — Пакажаце саўдзіту Музей народнай культуры Палесся, борці дзядзькі Язэпа, нафтаправод «Дружба», дом Алавяна, аддзяленне Міністэрства правільнадумства і паводніцкага накіравання мас, камень вікінгаў, аграсядзібу. Пра Мардавыя аўтаматоны не забудзьцеся... Вы мяне слухаеце?

Першы намеснік пераключыўся на тэлефонную размову з такім жа недарэкам, як і сам, і адцягнуўся толькі пасля таго, як старшыня ляпнуў далоняй па стале.

— Не зганьбіце сябе, Арцём Баніфацьевіч. Госць з Саудаўскай Аравіі збіраецца ўкласці ў «Бальшавіцкі ўгар» грошы. А інвестыцыі патрэбныя калгасу як паветра. Казна пустая, так што выкручвацца прыйдзецца нам самім.

Быць прадаўжальнікам «слаўных» традыцый князя Пацёмкіна Цевель гідзіўся, аднак без «паказухі» было ніяк не абысціся: зажратыя еўрапейцы і амерыканцы не спяшаліся ўкладваць у Рэспубліку для народа крэўныя долары і еўра. А кітайскія падачкі былі горшыя за кабалу: лепш ужо адразу ў вір з камнем на шыі.

У сувязі з тым, што нават Камітэт Захавання Сацыяльнай Стабільнасці не ведаў, куды дакладна прыедзе саўдзіт, вырашана было акультурыць усе вёскі і пасёлкі раёна. Але з-за хранічнага дэфіцыту бюджэту рамонт выйшаў касметычным.

Неабходнасць тэрміновага прыцягнення ў Рэспубліку для народа замежнага капіталу патрабаваў і загад сталічнага начальства — кур'ер дзяржаўнай фельд'егерскай сувязі з'ехаў пяць хвілін таму, прымусіўшы ў сябе на вачах спаліць канверт, крывава-чырвоны ад шматлікіх штампаў «Зусім сакрэтна!».

— Чаму я? — працаваць першы «першы намеснік» не любіў. Любая праца выклікала ў Пухныша алергію з вострым жаданнем перакласці абавязкі на іншых. На каго заўгодна. Толькі б нічога не рабіць самому.

Цевелю стала зусім сумна: ад віду лайдака будучыня Рэспублікі малявалася выключна ў цёмных танах. Саўдзіт, нягледзячы на запэўніванні рэспубліканскіх уладаў у стварэнні для яго самага спрыяльнага клімату, быў выключэннем з правілаў. Але і мільён долараў на зямлі не валяецца. Асабліва ў Бульбянцы.

— Выпішу прэмію з калгаснага фінансавага рэзерву.

Пухныш фыркнуў. Увесь «Бальшавіцкі ўгар» разам з калгаснікамі, прыбыткам за ўраджай пшаніцы на чвэрць стагоддзя наперад і выручкай ад рэдкіх замежных турыстаў, якія заблудзіліся сярод палескіх балотаў, каштаваў менш за ягоны новы айфон.

Старшыня цяжка ўздыхнуў і, чаго трываць не мог, ударыў ніжэй пояса:

— Давядзецца патэлефанаваць вашаму бацьку.

— Базару няма, Мікалаевіч! Толькі тату не турбуйце!

З кабінета першы намеснік выйшаў у моцным раздражненні. Ідыёцкае даручэнне ад балвана не на сваім месцы. Яшчэ і ўказваць яму будзе!

Пры ўсім жаданні паслаць старшыню на тры літары Пухныш не мог, паколькі прыдуркаватаму роднаму бацьку, які засунуў яго ў дзірку пад назвай Бульбянка, нічога не каштавала ў гневе пазбавіць сына грашовага ўтрымання. І пад хатні арышт, з яго станецца, можа адправіць. А дома Арцём Пухныш на самаізаляцыі ад covid–19 насядзеўся. Нуда смяротная: ні выпіць, ні кабет паклікаць.

Церусіў халодны раннесакавіцкі дождж, што зусім не спрыяла з'яўленню добрага настрою.

— І дзе гэты чортаў чабурэк?

З прычыны невысокага ўзроўню IQ, розніцы паміж словамі «чабурэк» і «абрэк» першы «першы намеснік» Пухныш не бачыў, роўна як і нічога не ведаў аб правілах ужывання словаў. Што зусім не перашкаджала яму, не ведаючы гора, пражыць дваццаць няпоўных гадоў.

Госць прыбыў на звышраскошным лімузіне ў суправаджэнні эскорту з чатырох цяжкіх браневікоў, набітых узброенай да зубоў аховай, якая спрэс складалася з маладых мускулістых дзяўчын.

Ні сам лімузін пяцідзесяці метраў даўжынёй, ні ахоўніцы ў залатых даспехах не аказалі на Пухныша адмысловага ўражання: набліжаныя да трону Самога жылі куды багацей. Яны і самі — без стратаў для ўласнага кашалька — маглі спансіраваць эканоміку Рэспублікі для народа, аднак аддавалі перавагу



Фота www.ok.ru

трымаць капіталы ў краінах з больш цёплым кліматам.

Саўдзіт — тыповы сярэднеўзроставы араб — быў апрануты больш чым сціпла, і Пухныш адразу страціў да яго ўсялякі інтарэс. Які сэнс у багацці, калі ім нельга пышыцца?.. Першы «першы намеснік» быў гатовы паказаць, як варта правільна жыць, няхай толькі бацька дасць яму такую магчымасць.

— І як я буду з чорнажоп... з чорным без перакладчыка размаўляць? — збянтэжыўся Пухныш, раз'юшана праклінаючы старшыню за такую «падставу».

Хвалявацца Пухнышу давялося нядоўга — саўдзіт бліснуў беласнежнымі зубамі і вымавіў:

— Чорны вучыўся ва Універсітэце імя Патрыса Лумумбы. Асаляму алейкум. Мяне завуць Бахір Васік Муафа Абд аль-Азіз ібн Аль-Хатаб ан-Нума ібн Зута ібн Мах аль-Фарук Абу-л-Абас. І я хацеў бы даведацца ўсё пра адмысловы шлях Рэспублікі для народа. Што дазваляе вам заставацца астраўком стабільнасці ў акіяне рукатворнага хаосу?

— Чё? — складаныя пытанні Арцём Пухныш не ўзлюбіў з таго моманту, калі яму сунулі ў рукі буквар. На думку першага «першага намесніка», «гаспадары жыцця» не павінны абцяжарваць сябе разумовым працэсам. Куды важней умець марнаваць грошы.

— Я думаў, дыплом доктара філалагічных навук не створыць мне складанасцяў пры зносінах з аўтахтонамі, — саўдзіт засмуціўся.

— Чё? — з ашаломленага Пухныша можна было ляпіць скульптуру Мінатаўра.

— Пазнаёмце, калі ласка, мяне з вашай перадавой гаспадаркай, — зайшоў з іншага боку саўдзіт. На гэты раз спроба атрымалася паспяховай. Пухныш матнуў «бычынай» галавой і пацягнуў госця, які загадаў ахове застацца, да дома другога «першага намесніка» Алавяна.

Дробнаштучная плітка, выкладзеная ў выглядзе рэспубліканскага арнаменту ноччу ў неверагоднай спешцы, прымусіла саўдзіта падняць вялікі палец уверх, а флюарэсцэнтная расфарбоўка праезнай часткі выклікала непадробнае захапленне.

— Я ў сябе ў Саудаўскай Аравіі такую ж зраблю!

— Ха, — абмежаваўся сціплай канстатацыяй перавагі рэспубліканскай ідэі Пухныш. Спяваць дыфірамбы не трэба было: першы «першы намеснік» рызыкаваў не скончыць нават першага сказа.

Платы́ з металапрофілю са сцэнамі старажытнаславянскага побыту, што выдаваўся за нядаўняе мінулае Бульбянкі, саўдзіту таксама спадабаліся.

— Неверагодная архаіка!

— Чё?

— Рэспубліканскі народ вельмі старажытны.

— А то! — па вялікім рахунку, першаму «першаму намесніку» было напляваць. Але ў Аддзяленні Міністэрства правільнадумства і паводніцкага накіравання мас настойліва загадалі ўсяляк падкрэсліваць самабытнасць і мудрасць рэспубліканскага ладу.

Саўдзіт быў чалавекам начытаным, і з гэтай прычыны без цяжкасці правёў аналогію паміж ярка-пернікавымі хатамі Бульбянкі і дамамі з нямецкай казкі «Гензель і Грэтэль», запісанай братамі Грым. Сэрца саўдзіта сціснулася ад чорнай зайздрасці, і ён паабяцаў сабе не шкадаваць ніякіх грошай для таго, каб падняць дабрабыт грамадзян Саудаўскай Аравіі да бульбянскага ўзроўню.

Раскошны трохпавярховы асабняк экс-дэпутата, які праявіў злачынную непаваротлівасць пры націску на кнопку «За» ў час галасавання аб павышэнні пенсіённага ўзросту, як ніякі іншы падыходзіў для ілюстрацыі выбуховага росту дабрабыту грамадзян Рэспублікі для народа.

— У вас у рэспубліцы ўсе так жывуць? — саўдзіт відавочна быў уражаны да самай глыбіні душы: сад у французскім стылі займаў дваццаць пяць гектараў самай лепшай зямлі і абслугоўваўся самымі майстравітымі садоўнікамі. Разам з ярка-пернікавымі хатамі гэта ўзмацняла пачуццё траплення ў рай.

— Усё для людзей, — паўтарыў афіцыйны слоган Пухныш і спрытна палез у заднюю кішэню джынсаў «Dolce & Gabbana»: гукавым сігналам нагадаў пра сябе айфон, зроблены на заказ.

Саўдзіт слізгануў захопленым поглядам па золаце, плаціне і дыяментам і вярнуўся вачыма да дома другога «першага намесніка». Экс-дэпутат меў благі густ, змяшаўшы ў архітэктурным злепку ўсё, што толькі магчыма, і капітал, які хіба што кроплю не дацягваў да сукупнага багацця самых багатых сем'яў Саудаўскай Аравіі.

— Ёпта, новыя кросадавы! — крама фірмовага абутку з адрасатам паведамлення аб новай мадэлі красовак не пралічылася: Пухныш, не збянтэжаны цаной са шматлікімі нулямі, рвануў да ўласнага дома, каб паказаць на сайце нумар аплатнай карты.

Саўдзіт жа, удосталь налюбаваўшыся домам Алавяна, вырашыў працягнуць экскурсію па Бульбянцы. Ён быў цвёрда ўпэўнены, што дасягненні Рэспублікі для народа ў галіне арганізацыі побыту рэспубліканцаў, прышчэпленыя ў пясках Саудаўскай Аравіі, дазволяць той стаць хоць бы другой пасля Рэспублікі для народа звышдзяржавай.

Якім жа было здзіўленне саўдзіта, калі ён не ўбачыў побач гіда...

Вуліцы вёскі з прычыны самага разгару пасяўной кампаніі былі пустыя, так што звярнуцца па дапамогу не было да каго. Прыпадабняцца дзікунам, якія крыкам пазначаюць свой статус, саўдзіт не стаў. Пакрочыў па вуліцы ў напрамку сельсавета, на заднім двары якога высілася чатырохметровая пазалочаная статуя мужчыны з ярка выяўленымі мангалоідна-бурацкімі рысамі.

І трэба ж было такому здарыцца — арганізму экстрана спатрэбілася пазбавіцца ад урыны. Саўдзіт пачаў азірацца ў пошуках прыбіральні, аднак на вочы не трапілася нічога падобнага. Вырашыўшы, што ў рэспубліканцаў пераважае духоўнае над матэрыяльным, саўдзіт сарамліва нырнуў у двары. І першым, што яму сустрэлася, быў цяжка гружаны смеццем прычэп ад трактара.

— А як жа клопат пра экалогію? — выказаў здзіўленне саўдзіт. Смеццевая гара відавочна брала свой пачатак у дагістарычныя часы. Мухі, якія хмарай віліся над прычэпам, памерамі маглі супернічаць з бамбардзіроўшчыкамі Б-52. Такіх памераў яны маглі дасягнуць толькі прытрымліваючыся спецыяльнай дыеты. Але каму патрэбныя мухі? Паўнавартасным бялком, наколькі было вядома саўдзіту, яны не былі багатыя.

Саўдзіт працёр вочы двойчы, аднак страшная карціна не знікла. Больш за тое — ударыла жудасным смуродам, прымусіўшы саўдзіта адступіць. Рухаўся ён спіной, таму і не заўважыў ямы.

— Khara!

Не мудруючы, «дарожнікі» проста заклалі яму дарожнымі знакамі і прысыпалі смеццем са злашчаснага прычэпа. І акуратнасцю пры гэтым не адрозніваліся. Такога не магло быць у Рэспубліцы для народа. Таму што быць не магло ў прынцыпе.

— Варожыя інтрыгі, — вырашыў саўдзіт і рушыў далей: арганізм прымушаў. Але ўжо праз паўсотні метраў саўдзіт быў вымушаны спыніцца: погляду Бахіра Васіка Муафы Абд аль-Азіза ібн Аль-Хатаба ан-Нумы ібн Зуты ібн Маха аль-Фарука Абу-л-Абаса паўстала поўнамаштабная копія Пізанскай вежы. Праўда, выключна па змесце — у архітэктурным дачыненні збудаванне нагадвала нямецкую гранату на драўлянай ручцы.

Саўдзіт дастаў з-пад бурнуса спецыяльна прыхаваны для фіксацыі дасягненняў рэспубліканскай эканомікі лічбавы фотаапарат і, робячы фатаграфіі, нетаропка абышоў воданапорную вежу. Збудаванне ўзвялі

зусім нядаўна — ніякага іншага тлумачэння мноству драўляных падпорак і рэек быць не магло. У Бульбянцы пайшлі далей, чым у Італіі: каб пазбегнуць шкоды ад вандалаў і псіхаманьякаў нанеслі на збудаванне графіці, якое не пакідала вольнага месца для хуліганства. Фантазія ў дызайнера-выканаўцы была багатай: доктар філалагічных навук набраў матэрыялу для дзвюх новых доктарскіх дысертацый.

Вось толькі саўдзіт так і не зразумеў, які сэнс праекціроўшчык уклаў у люфт: варта было толькі не самай буйной вароне апусціцца на дах аналага Пізанскай вежы, як усё збудаванне затрэслася, як хворы ў прыпадку эпілепсіі.

Аднекуль са шчыльнай аднапавярховай забудовы, прымусіўшы саўдзіта падскочыць ад спалоху, данёсся злы крык:

— Пайшла прэч, падла!

У паніцы ўзляцелі яшчэ і галубы, якія выкарыстоўвалі пазалочаную статую Леніна ля сельсавета ў якасці адыходжага месца. Саўдзіт мімаволі пазайздросціў свабодзе птушыных і задаволена кіўнуў — на вуліцах Рэспублікі для народа спакойна нават ноччу. Міліцыя не дрэмле.

Грозны рык не паўтарыўся, затое з новай сілай нагадаў пра сябе мачавы пузыр. Саўдзіт закруціў галавой. Туалета не ўбачыў, аднак стаў сведкам таго, як старая як сам сусвет жанчына набірае ваду. Калодзеж аказаўся драўляным і патрабаваў пэўнага спрыту і высілкаў. Дастаткова было ўскубнуць сябе, каб зразумець, што гэта ніякі не міраж.

Саўдзіт з падвоенай сілай пачаў азірацца, але пацверджання збаўчай думцы не сустрэў: дакументальны фільм пра невынosны побыт сялян дзевятнаццатага стагоддзя ніхто не здымаў. І сутнасць розыгрышу не было зразумець, колькі саўдзіт не напружваў мозг.

Старая ў два заходы набрала вады і пацягнула за пятлю з бялізнавай вяроўкі самаробную каляску з вядром, а ўражаны саўдзіт нават зазірнуў у калодзеж. У вадзе адбіўся здзіўлены твар Бахіра Васіка Муафы Абд аль-Азіза ібн Аль-Хатаба ан-Нумы ібн Зуты ібн Маха аль-Фарука Абу-л-Абаса: да музейных экспанатаў калодзеж не адносіўся.

— Не чакаў ад ІТ-краіны такой архаікі… — мінулае ў Саудаўскай Аравіі шанавалі і паважалі, але нават самыя фанатычныя вахабіты не жадалі зацыклівацца выключна на ім.

Адольваемы супярэчлівымі пачуццямі, саўдзіт пайшоў далей. Арыентавацца было цяжка: ні табе электронных інфармацыйных панэляў, ні паказальнікаў, ні таблічак на дамах не мелася, а дроны ў небе не віселі. Ды і самі дамы кардынальна адрозніваліся ад «цацачных» пабудоў ля сельсавета.

«Трушчобы», — вырашыў саўдзіт. Нават для самых багатых краін бедняк не былі чымсьці з шэрагу незвычайнага. Толькі не для Рэспублікі для народа. Бахір Васік Муафа Абд аль-Азіз ібн Аль-Хатаб ан-Нума ібн Зута ібн Мах аль-Фарук Абу-л-Абас для таго і прыехаў у Бульбянку, каб зразумець, як гэта рэспубліканцам удалося пабудаваць грамадства ўсеагульнага дабрабыту.

Саўдзіт бег зайцам і здзіўляўся: жыхары Бульбянкі карысталіся газавымі балонамі і абаграваліся дровамі. А яшчэ карміліся з зямлі: нават далёкаму ад сельскай гаспадаркі саўдзіту было зразумела, што для кветнікаў узаранай зямлі занадта шмат. І аралі зусім не трактарам.

Праз нейкі час саўдзіт выйшаў да аднапавярховага белацаглянага будынка з жалезнымі кратамі на вокнах. На ўваходных дзвярах вісеў гіганцкі замок. Такі саўдзіт бачыў у музеі Сярэднявечча. Шыльды на дзвярах не было, і саўдзіт зазірнуў у запыленае акно. Ад убачанага бровы саўдзіта ўзляцелі да самай куфіі: асартымент не цягнуў нават на статус прадуктовай крамы.

— Нічога не разумею.

Бахір Васік Муафа Абд аль-Азіз ібн Аль-Хатаб ан-Нума ібн Зута ібн Мах аль-Фарук Абу-л-Абас нарадзіўся за тысячы кіламетраў ад Бульбянкі, інакш быў бы ў курсе таго, што кожны дзень, за выключэннем суботы і нядзелі, з трынаццаці да чатырнаццаці нуль-нуль па агульнарэспубліканскім часе прадаўшчыца сельпо Клаўдзія фон Дурэмба карыстаецца сваім законным правам на абед. І прымусіць яе змяніць графік мог хіба што Армагедон.

Бела-чырвоная вышка сотавай сувязі вярнула было саўдзіту душэўную раўнавагу, але праселы дах зернятока зачапіўся як якар. З падручніка гісторыі саўдзіт ведаў, што хвалісты матэрыял называецца «шыфер», аднак толькі цяпер атрымаў магчымасць пераканацца, наколькі ён непрактычны: пад цяжарам часу лісты паспаўзаліся ў розныя бакі, пакінуўшы прарэхі. У некаторыя з іх мог свабодна пралезці дарослы чалавек.

Саўдзіт любіў навуковую фантастыку, але версію з патрапленнем у мінулае давялося адкінуць: неба над Бульбянкай рассякалі адразу тры рэактыўныя самалёты.

Частку вокнаў будыніны прыкрывалі лісты бляхі і жалеза. Усе яны былі рознага памеру і большай часткай апельсінава-аранжавай афарбоўкі, што сумесна з рагамі ад іржы і цэглай, якая рассыпалася, стварала ўражанне актыўнага выкарыстання будынка як арт-аб'екта п'янымі авангардыстамі, якія да таго ж не цураліся і цяжкіх наркотыкаў.

Са ступару саўдзіта вывелі цяжкія крокі за спіной. Мачавы пузыр ледзьве не апаражніўся сам: перад саўдзітам стаяў еці.

Папяроса ў роце пачвары літаральна ўдарыла саўдзіта пад дых. А затым еці яшчэ і загаварыў:

— Агн сць?

— Чё? — міжволі вырвалася ў доктара філалагічных навук.

— Агн сць? — еці зноў забіць і смуродам, і лапатай. Адкуль у пачвары запэцканая ў чымсьці вадкім лапата-«шуфель» са слізготкім шмаццём, хацелася разбірацца менш за ўсё. Саўдзіт з усіх ног кінуўся наўцёкі. Дарогі не разбіраў.

— Знчцц нм, — кіўнуў сам сабе вартаўнік Міхей Спартанец і вярнуўся ў зерняток, дзе яго чакаў чан з растворам: старшыня загадаў замазаць усе расколіны ў сцяне.

Саўдзіт мог бегчы доўга — страх і абанемент у дарагую фітнэс-залу дазвалялі. Аднак не дазволіў грузавік, які нечакана вырас на шляху: МАЗ, які здаўся саўдзіту хтанічным монстрам, з сілай ударыў у грудзі. Але ў горла не ўчапіўся.

Нервовае напружанне выплюхнулася істэрычным смехам. Калі на змену смеху прыйшла ікаўка, саўдзіт падняўся. І шумна праглынуў, адчуваючы, як пачынаюць варушыцца валасы па ўсім целе: Бахір Васік Муафа Абд аль-Азіз ібн Аль-Хатаб ан-Нума ібн Зута ібн Мах аль-Фарук Абу-л-Абас стаяў пасярод могілак разнастайнай тэхнікі, якая мела сельскагаспадарчае прызначэнне. Некаторыя машыны былі яшчэ зусім новымі.

— Koosomak!

Сотні, калі не тысячы тон металу проста гнілі пад адкрытым небам. Нават без уліку таго, што расцягнулі марадзёры, сума атрымлівалася астранамічная. На рамонт дакладна хопіць.

У аблвыканкаме саўдзіта горача запэўнілі, што ў вобласці няма ні адной адсталай гаспадаркі. Усё ж такі Рэспубліка для народа, а не якія-небудзь задрыпаныя ЗША. А асабісты вадзіцель не мог пераблытаць адрас. І тут саўдзіт успомніў яшчэ аб адным месцы, у якім таксама збіралася новая тэхніка.

Зона адчужэння Чарнобыльскай АЭС…

Саўдзіта накрыў дзявяты вал страху: з радыяцыяй жарты дрэнныя. Бахір Васік Муафа Абд аль-Азіз ібн Аль-Хатаб ан-Нума ібн Зута ібн Мах аль-Фарук Абу-л-Абас кінуўся прэч. А прырода і людзі, як у якім-небудзь малабюджэтным фільме жахаў, перашкаджалі выратаванню: бур'ян у рост чалавека, іржавы калючы дрот на гнілых тэлеграфных слупах, зарослыя меліярацыйныя каналы, горы пустых пластыкавых бутэлек, падмурак жылога дома, укапаныя ў зямлю аўтамабільныя пакрышкі, кінутыя акумулятарныя батарэі, рознапамерныя валуны і нястрымная расліннасць, якая жвава прачыналася пасля зімы.

Моцныя мары вельмі часта становяцца рэальнасцю — сустрэча саўдзіта з туалетнай кабінкай, сабранай з аполкаў, руберойда і шыферу, магла служыць пацвярджэннем. Бахір Васік Муафа Абд аль-Азіз ібн Аль-Хатаб ан-Нума ібн Зута ібн Мах аль-Фарук Абу-л-Абас атрымаў культурны шок: дзверы з какетлівым сэрцайкам віселі на адной іржавай пятлі, прагнілы насціл асеў пад небяспечным вуглом, над скамянелым калам вакол адтуліны віліся тлустыя мухі, гільза ад снарада калібру дзвесце пяцьдзясят міліметраў была напоўнена змятымі абрыўкамі афіцыйнай «Чырвонай Бульбарусіі» з характэрнымі фекальнымі мазкамі…

Смурод не пакідаў ніякіх сумненняў у тым, што прыбіральняй працягвалі карыстацца.

У стане глыбокага нервовага ўзрушэння Бахіра Васіка Муафу Абд аль-Азіза ібн Аль-Хатаба ан-Нуму ібн Зуту ібн Маха аль-Фарука Абу-л-Абаса знайшлі ратавальнікі. Асабістым самалётам у найстражэйшай сакрэтнасці яго адправілі ў Саудаўскую Аравію, дзе наступныя дваццаць пяць гадоў Бахір Васік Муафа Абд аль-Азіз ібн Аль-Хатаб ан-Нума ібн Зута ібн Мах аль-Фарук Абу-л-Абас праходзіў курс паглыбленай псіхалагічнай рэабілітацыі.

Першы намеснік Пухныш — дзякуючы пратэкцыі і грошам бацькі — абышоўся толькі вуснай заўвагай. Старшыня калгаса «Бальшавіцкі ўгар» Цэвель атрымаў строгую вымову з занясеннем у асабістую справу: «за правал рэспубліканскай палітыкі прыцягнення замежных фінансавых сродкаў для паскарэння фарсіраванага рашэння дзяржава-будаўнічых задач у лакальных маштабах».

Праўда, гледзячы на асфальт на галоўнай вуліцы, брукаваныя дробнаштучнай пліткай тратуары, новыя платы з металапрофілю, саджанцы клёна і каштана, пасвяжэлыя фасады дамоў, знерваваўся не моцна.

— Затое Бульбянка хоць трохі палепшала.

На правядзенне рэспубліканскіх «Дажынак» Бульбянцы спадзявацца не выпадала.

Ад мудрасці да дурасці — адзін крок



Уладзімір КАРОТКІ

***

Ад мудрасці да дурасці —
адзін маленькі крок.
Ад дурасці, па мудрасці, прашу,
каб Бог збярог…

***

Пятро заўсёды голас меў –
Галасаваць, аднак, не ўмеў.

***

Праём разоў сто сорак мерыў, —
І ўсё ж купіў не тыя дзверы.

***

Дурны асу ў далонях песціць –
Аса там хутка джала змесціць.

***

Сын бацьку смела павучае.
Каму з іх клёпак не хапае?

***

Жук гнаявы: «Я ўсё ж лятаю!
Арла няма — я замяняю».

***

Убачыў Певень жонку Кракадзіла:
«Нясе таксама яйкі —
вось дык дзіва.
Давай, — ён Кракадзілу кажа, —
жонкамі мяняцца…».
А што з таго абмену —
можна здагадацца.

***

Лізаў ланцуг сабака столькі год
За тое, што ланцуг свабоду перамог.

***

Змяя Арла схапіць хацела —
Вось толькі крылаў не займела.

***

Баран быць мудрацом жадае,
Ды галава перашкаджае.

***

Купіла Малпа акуляры.
І што з іх? Толькі шкло на твары.

***

Алень узяў ды скінуў рогі —
Не памаглі ва ўцёках ногі.

***

Свінні яды было ўсё мала,
Пакуль сама ядой не стала.

***

О, як сябе мы часта губім,
Калі адно сябе мы любім.

***

Рукі каханай дакрануўся:
Сябе забудзь — ты ў ёй прачнуўся.

***

Крумкач гняздо звіў на тапалі,
А перапёлка — сярод поля.
Дзяцей іх гэткі ж лёс чакае:
Хто ў неба —
а хто з неба пазірае.

***

Усеўся ты калі на сук —
Піле тваіх не трэба рук.

***

Калі ты ў полі ловіш вецер:
Жыццю канец — прыходзіць вечар.

***

Каб кветкай летам любавацца,
Вясною трэба пастарацца.

***

Калі віно паставілі на стол,
То ад гасцей кілішкаў не хаваюць.
Віно зазвычай разам выпіваюць.
Інакш — навошта і віно, і стол?

Вятры агаляюць душы

Роздум пра аўтарку і кнігу

Валер ГАПЕЕЎ

Юльяна Пятрэнка. Харунжы. Verbera ventorum : раман / — Мінск: Кнігазбор, 2020. — 228 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; серыя «Пункт адліку»).

Стаўленне маё да гістарычнай мастацкай прозы далёка не роўнае. Тут не проза вінаватая, а я сам: калі ў кнігах дзейнічаюць знакамітыя гістарычныя персанажы, хутчэй за ўсё, адкладу кнігу. Новую кнігу Юльяны Пятрэнкі «Харунжы. Verbera ventorum» пагартаў, уцяміў, што галоўны герой — шараговы ваяр, то з чыстым сумленнем стаў чытачом…

Нашы пісьменнікі тым і пісьменнікі, што кожны піша асабліва. Неяк давялося пачытаць, што ўласна літаратура — найперш стыль. Нехта піша мудрагеліста; чытаеш — бы пазл складаеш; у некага проза вязкая; тут — сухая і лаканічная; груБастая; матэматычна-выверaная; мяккая-лагодная; жорсткая; музыкальная… Калі б мажліва было нейкім усяго адным словам характарызаваць прозу аўтараў, то ў адносінах да гэтай маладой пісьменніцы, не раздумваючы асабліва, ужыў бы выраз «настраёвая». І гэты настрой — радасць жыцця. Ці будзе гэта трагедыйная «Авяльга», драматычная «Няпрошаныя госці», — ты чуеш у мелодыях радкоў светлую музыку жыццядайнасці.


Кажу гэта таму, што мной прачытана большая частка з таго, што публікавалася ў перыёдыцы і выдавалася пад імем Юльяны Пятрэнкі. За творчасцю гэтай маладой жанчыны сачу ад 2016 года, здаецца. І, прызнаюся, мяне вельмі ўсцешваюць усе яе публікацыі і поспехі.

Наша сустрэча адбылася ў віртуале: выдавецтва «Рэгістр» праводзіла конкурс «1 глава». Зразумела, выдавецтва шукала сабе аўтараў адпаведна свайму бачанню літаратуры, якая прынясе прыбытак на рынку. Сярод маладых аўтараў-канкурсантаў была і Юльяна Пятрэнка з тэкстам-фэнтэзі на рускай мове. Тады тэксты ўдзельнікаў конкурса я прачытаў усе, і, прызнаюся, замаркоціўся. Але тэкст Юльяны Пятрэнка здзівіў. Першае: тут быў той самы настрой, пра які я казаў вышэй, і нават больш: тут была зухаватасць, гульня, самая поўнасць маладога жыцця. А яшчэ я чытаў рускамоўны тэкст, а чуў беларускую мову. Гэта было нашае, адвечнае беларускае мысленне, наша беларуская логіка і пабудова. То і спытаў: а ёсць што напісанае на беларускай мове? Ёсць, быў адказ, ляжыць нешта накрэмзанае. Пачытаў. Здзівіўся і парадаваўся: тут быў стыль. Свой, асаблівы. Было сваё бачанне, быў цвёрды грунт ведаў і жыццёвага вопыту з россыпам каштоўных каменьчыкаў фальклору і народнай мудрасці, што назапасіла аўтарка ад сваіх продкаў.

Публікацыі Юльяны Пятрэнка ў часопісах «Маладосць», «Полымя», «Дзеяслоў», альманахах выклікалі да аўтаркі непадробную цікавасць. Было відавочна, што ў нас з'явіўся новы годны творца. Сапраўдны фурор сваімі творамі яна выклікала ў родным Гомелі — пераканаўча заваёвае Гран-пры абласнога конкурса маладых літаратараў Гомельшчыны, зборнік апавяданняў «На досвітку» выдаецца асобнай кнігай і атрымлівае прэмію Кірылы Тураўскага. Аддзяленні двух Саюзаў пісьменнікаў — СБП і СПБ — пачынаюць апекавацца аўтаркай, разлічваючы займець яе ў сваіх шэрагах.

Але адбываецца нешта не самае звычайнае: у свае 30 з нечым Юльяна Пятрэнка паступае ў Школу маладога літаратара пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў. Крок яшчэ той: яна вучылася разам з тымі, хто быў маладзей за яе. Спецыяльна акцэнтую на гэтым увагу. У той час, як некаторыя аўтары, нашмат маладзейшыя, выдаўшы пару (заўважым: не такіх і паспяховых) кніг, раптам ствараюць свае «школы пісьменніцкага майстэрства», Юльяна Пятрэнка ідзе вучыцца.

Кніга «Харунжы. Verbera ventorum» стала вынікам «саюзнага» навучання і атрымлівых ведаў. Ад кароткіх апавяданняў, ад невялікай прыгодніцкай аповесці і дзіцячай казкі Юльяна Пятрэнка падышла да стварэння гістарычнага рамана. І справілася на выдатна.



Гістарычная праўда ў антуражы, у дэталях, у бытапісанні. Няцяжка здагадацца, што за кароткім радком у кнізе часам стаіць няпростая вышуковая праца. Такім чынам, аўтар не проста распавядае аб новых прыгодах сваіх герояў, але ўзнаўляе максімальна праўдзівa той час. Праўдзівасць у стварэнні вобразаў і антуражу ўрэшце ствараюць сапраўдную атмасферу тагачасся.

У Юльяны Пятрэнка свой пазнавальны паўсюль стыль. Яна — выдатны апавядальнік, умее не проста заваладаць увагай і стварыць настрой, але захапіць чытача гэтым настроем.

У чытача-мужчыны стаўленне да прыгодніцкай ды яшчэ ваеннай прозы, напісанай жанчынай, заўсёды трохі паблажлівае. Але што тычыцца Юльяны Пятрэнкі, то хай бы хто з мужчын паспрабаваў апісаць лепш бой на шаблях у XVII стагоддзі, і каб пры гэтым не саграшыць супраць ісціны ў апісанні той самай шаблі і спосабаў яе мацавання да пояса ваяра. Ведаю, што пры стварэнні свайго рамана Юльяна карысталася не адной крыніцай, турбавала не аднаго даследчыка, распытвала не аднаго гісторыка.

Гэта тое, што лічыцца, так мовіць, тэхнічнай часткі.

Пра ідэйную сутнасць рамана «Харунжы. Verbera ventorum» можна гаварыць многа. Мне ж бачыцца асаблівая патаемная сувязь галоўнага героя рамана і самой аўтаркі. У пэўным сэнсе і харунжы, і Юльяна Пятрэнка ў свой час апынуліся на раздарожжы, што прадзімалася ўсімі вятрамі з розных бакоў. І кожнаму трэба зрабіць свой крок…

Вярнуся ў часе да конкурса «Рэгістра». Юльяна Пятрэнка, амаль не сумняваюся сёння, цягам часу дасканала авалодала б майстэрствам напісання фэнтэзі на рускай мове, публікавала б бясконцыя серыі на нейкіх рэсурсах, мела б грошы з продажу сваіх электронных кніг, — так бывае, і так ёсць, і так магло б рэальна быць. Талент, калі ён ёсць і не прыдушваецца побытам і асабістай ленасцю, заўсёды прабівае сабе дарогу і вяртаецца нейкім прыбыткам. Мог бы і для Пятрэнкі вярнуцца больш-менш істотнай фінансавай падтрымкай.

Яна ж выбірае беларускую мову ды ідзе туды, дзе ад пачатку не можа існаваць грашовага дабрабыту. Дзе напісанне — гэта толькі покліч душы, дзе ўся радасць ад выдання кнігі — першы момант дакранання да вокладкі, што пахне друкарскай фарбай, ды першая станоўчая рэцэнзія на твой твор. Юльяна Пятрэнка абрала шлях сучаснага беларускага пісьменніка з першым клопатам: дзе і за што выдаць кнігу і пасля з расцягнутым у часе другім клопатам пра тое, ці разыдзецца тыраж, ці рызыкне яшчэ раз якое выдавецтва на выданне новага твора. Згадзіцеся, яна б і тут яшчэ змагла зрабіць свой выбар: да якой суполкі пісьменнікаў падацца. Быць у адной — мець адно клопат ды чыста духоўную падтрымку і еднасць. Быць у другой — глядзіш, афіцыйныя мерапрыемствы кшталту Дня пісьменства, запрашэнні ў школы, бібліятэкі ды ўніверсітэты, інтэрв'ю ў праўладных газетах, граматы ды падзякі, магчымы кар'ерны рост у самой суполцы, а там і да медаля недалёка — іх сёння шмат раздаюць у СПБ: ад выпіленага з тонкай фанеры да сапраўднага кшталту «За вялікі ўнёсак у літаратуру» ці Францыска Скарыны нават.

Ведаю, Юльяна Пятрэнка пакуль на раздарожжы, можа, яшчэ і таму, што сама не ацэньвае сваю працу настолькі, каб звацца пісьменніцай. Дзівачка, праўда? У нас вунь з адным апублікаваным у часопісе апавяданнем гучна кажуць пра сябе «пісьменнік» — і ніколечкі не саромеюцца, і здзіўляюцца, калі ты здзіўляешся іх статусу, якім іх узнагародзілі сябры і сяброўкі па тусоўцы.

Гады маёй журналісцкай практыкі пераканалі ў тым, што беларускія карані творчага чалавека, толькі палі іх жыватворнай вадой падтрымкі і адвагі, ажываюць, ідуць у рост. На маім кароткім веку трое аўтараў, што пачыналі пісаць вершы і прозу на рускай мове, пасля пераходзілі на беларускую, нават дасканала не ведаючы яе, але ўцягваліся, адточвалі сваё майстэрства і казалі пасля, што ім…лягчэй, нават не валодаючы вялікім лексічным запасам, перадаць свае пачуцці на роднай мове. Менавіта таму мне так неабыякавая творчасць Юльяны Пятрэнка. У вельмі няпросты час яна зрабіла свой выбар, цяпер вось у найскладанейшы для ўсіх беларусаў час ёй трэба рабіць яшчэ адзін крок.

І ў гэты самы час, які літаратуразнавец Ганна Кісліцына назвала «не да чытання», выходзіць раман Юльяны Пятрэнка «Харунжы. Verbera ventorum». Гэтай кнізе будзе няпроста патрапіць да свайго чытача, няпроста будзе быць прачытанай, калі патрапіць, няпроста будзе быць зразумелай і ацэненай, калі будзе прачытаная. Хоць аўтарка і выбрала для свайго рамана самы лепшы падыход для гістарычнага твора: прыгоды з элементам дэтэктыву. На імклівую плынь прыгодніцкага аповеду накладваецца быццам і лёгкі флёр глыбокай ідэйнасці, філасофскіх развагаў. Тут за бойкамі-пагонямі-пошукамі выяўляюцца як лепшыя якасці чалавечай душы, так і чорны яе бок. Тут за знешняй меладраматычнасцю расстання каханых прарастае адвечнае пытанне: каханая ці айчына?

Доўг ці пачуццё?

Выгада ці сумленне?

Вернасць ці скарэнне?

Хто скажа, што сёння гэтыя пытанні не ў цэнтры нашага жыцця?

…Некалі выйшла кніга Андрэя Федарэнкі «Мяжа». Помніцца, у адным крытычным водгуку пачуў: занадта рана непакоіцца аўтар пра лёс беларускай літаратуры. Мне таксама тады на нейкі момант падалося, што аўтар, агучваючы страту сувязі пакаленняў і прадаўжэння традыцый, трохі згусціў фарбы. Але сёння, сам дажыўшы да недалёкага 60-годдзя, азіраюся на бакі, і сумна: не бачу хоць бы дзясятку два тых беларускамоўных аўтараў, якім цяпер па 20–40 гадоў і якія б свяціліся хай не звыш-новымі, але хаця б проста зорачкамі свайго неаспрэчнага таленту. Калі памыляюся — папраўце мяне. Тыя постаці, якія бачу, можна пералічыць на пальцах рук…

Таму так важны нам кожны новы аўтар. Тым больш з тых, у каго з усіх жаданняў прэваліруе адно: пісаць. Хто не саромеецца вучыцца ў свае «трыццаць з хвосцікам», у гэтым узросце толькі пачынаць і звацца маладым пісьменнікам. Хто, ідучы ў літаратуру, ведае, што ўжо страціў усе шанцы быць адзначаным у шматлікіх конкурсах маладых аўтараў, бо па ўзросце выпаў з «абоймы маладых штыхоў», хто праляцеў з творчымі стыпендыямі для маладых аўтараў, не мае шанцаў на атрыманне гранта і не мае «карыснага сяброўства», якое ў наш час, будзем цынічна праўдзівымі, хай яшчэ не хлеб з маслам, але ж не дасць з голаду памерці.

Але тым не менш, ідзе.

І хай надта прыкра, што такіх мала, ды грэе сэрца і спараджае надзею тое, што ўсё ж — ідуць.

Літаратурная Беларусь

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 354-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by